**В. С. Варапаева Т. С. Куцанава**

# ЛІТАРАТУРНАЕ ЧЫТАННЕ

Вучэбны дапаможнік для 3 класа
спецыяльных агульнаадукацыйных школ
з беларускай мовай навучання

У дзвюх частках

Частка 2

*Дапушчана Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь*

Мінск
«Выдавецкі цэнтр БДУ»
2011

Правообладатель Издательский центр БГУ

УДК 821.161.3.09(075.2=161.3)–056.313
ББК 74.3
В18

Рэцэнзент
кафедра беларускага і рускага мовазнаўства
факультэта пачатковай адукацыі ўстановы адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(кандыдат педагагічных навук дацэнт кафедры
*В. І. Свірыдзенка*)

**Умоўныя абазначэнні:**

 слоўнік

 чытае настаўнік

 чытае і тлумачыць настаўнік

?! пытанні і заданні

* заданне ўзмоцненай складанасці

ISBN 978-985-476-875-5 (ч. 2)
ISBN 978-985-476-873-1

© Варапаева В. С., Куцанава Т. С., 2011
© Афармленне. РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»,
2011

Правообладатель Издательский центр БГУ




# НАПІСАЎ Я КАЗКУ — СЛУХАЙ, КАЛІ ЛАСКА!



## ЛІТАРАТУРНАЯ КАЗКА

Яна падобна да народнай. Але ў адрозненне ад народнай літаратурная казка мае свайго аўтара — пісьменніка. Аўтар, складаючы казку, можа выкарыстаць народны сюжэт (змест) або прыдумаць свой.

### Дружбакі

На лясной паляне жылі па суседству Заяц і Вожык. Зверкі адзін без аднаго і дня не маглі пражыць.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Аднойчы Заяц сказаў Вожыку:

— Мы з табою такія дружбакі, што вадою нас не разліць!

— Нават вялікі дождж, — у тон яму адказаў Вожык.

Пачула гэта Хмара і не на жарт раззлавалася:

— А мы яшчэ паглядзім!— І склі́кала сваіх дзяцей.

— Дапамажыце, дзетачкі, напалохаць вунь тых смельчакоў, — паказала на Зайца і Вожыка.

— Я згодная! — першай адказала Маланка і паласнула агнявым бізуном.

— Тррэба — мы гггатовыя! — заракатаў Гром.

А Дождж нічога не сказаў, толькі з усіх сіл пачаў паліваць лес.

— Пабеглі да мяне, перачакаем дождж, — прапанаваў Вожык.

— Не, у мяне хата большая!

— У мяне самавар паставім, чай заварым...

Так і не дагаварыўшыся, звяркі разбегліся. Кожны ў сваю хату.

Раз-пораз бліскала Маланка, грымеў Гром. Сумна і страшна Зайцу аднаму ў хаце.

— Дарэмна я не паслухаўся Вожыка, — пашкадаваў Заяц. — Як радасна было б разам! Можа, ён таксама адзін дома. І яму таксама сумна. Пабягу да Вожыка!



Правообладатель Издательский центр БГУ

«Але ж на двары дождж, — з бояззю падумаў Заяц. — Нічога, да Вожыкавай хаткі зусім блізка».

— Чаму я пакрыўдзіў Зайца? — шкадаваў Вожык. — Зараз нам удваіх было б лепш!

Выбеглі зьяркі са сваіх хатак, сустрэліся на паўдарозе.

— Табе сумна было, Вожык?

— Сумна. А табе?

— Вельмі.

— А цяпер?

— Цяпер весела...

Стаяць, размаўляюць, не зважаюць на дождж. Смяюцца, радасныя, быццам даўно-даўно не бачыліся.

Зразумела Хмара: не разлучыць ёй сяброў, прашаптала:

— Нічога, знайду такіх, што мяне збаяцца і ад дружбы адмовяцца! — І паплыла далей.

А хіба знойдуцца такія?

*Расціслаў Бензярук*

**Бізу́н** — плець для пакарання.

?! **1.** Ці спадабалася вам казка? Чым?

**2.** Прачытайце, хто і як вырашыў пасварыць сяброў.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**3.** Як адчувалі сябе звяркі ў час дажджу ў сваіх хатах?
**4.** Пра каго кажуць: «Іх вадой не разліць»?
**5.** Адкажыце на пытанне апошняга сказа.
**6.** Чаму апавяданне называецца «Дружбакі»?
**7.** Размяркуйце ролі і прачытайце казку па ролях.
* **8.** Успомніце або прыдумайце прыказку пра сяброўства.

па-шан-ца-ва́-ла, ус-хва-ля-ва́-на-я, аб-на-дзе́-і-ла

## Як Мышка сама сябе ашукала

Пашанцавала неяк Мышцы — адшукала кавалачак сыру.

«Ой! — узрадавалася Мышка. — Гэта ж не толькі мне, але і маім мышанятам паласавацца хопіць! Вось свята будзе!»

Схапіла Мышка сваю смачную знаходку, дахаты пабегла. Адкуль ні вазьміся — Кот.

— Ну што, — кажа, — сама мне сыр аддасі ці табе мая парада патрэбна?

Мышка аж спатыкнулася ад страху, хітраваць пачала:



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Навошта табе, паважаны Кот, такі маленькі кавалачак сыру? І на адзін зуб не хопіць. А за вуглом, на ганку крамы, сыру колькі хочаш. Цэлых пяць кашоў з рознай смачнай ежай. Бяры ўсё, што пажадаеш. Я дык толькі вось гэты кавалачак узяць змагла...

Мышка так у зман увайшла, што сама сваёй хлусні верыць пачала. Нават аблізнулася.

І Кот, гледзячы на Мышку, таксама аблізнуўся. Хацеў нешта сказаць, але яго апярэдзіў Певень, які сядзеў на плоце.

— А круп там ніякіх не бачыла? — спытаў ён у Мышкі.

— І крупы ёсць, — сказала Мышка. — Розныя.

— Тады я паляцеў! — залопаў крыламі Певень і сарваўся з плота.

— А гнілых яблыкаў там няма? — заварушылася ў лужыне Свіння.

— І яблыкі ёсць! — запэўніла Мышка. — Там іх, яблыкаў гэтых, цэлая гара.

— Трэба бегчы! — падхапілася з лужыны Свіння.

— Можа, там і косці ёсць? — пацікавіўся віславухі Шарык.

— Колькі хочаш! — працягвала хлусіць Мышка.

— Чаго ж я тут сяджу? — выскачыў з будкі Шарык. — Пабягу!..



Правообладатель Издательский центр БГУ



Тут і Кот не вытрымаў. Забыў пра Мышку з яе кавалачкам сыру, услед за Шарыкам куляй паляцеў.

Хіхікнула Мышка: лоўка яна Ката ашукала! Хвосцікам вільнула і ў норку шмыгнула. Мышанят сырам пачаставала, сама паела. Толькі адпачыць сабралася, як суседка забегла. Усхваляваная, залапатала:

— Сядзіш тут? А за вуглом, на ганку крамы, выставілі пяць вялізных кашоў з рознай смачнай ежай. Усе могуць браць бясплатна... Пабеглі хутчэй!..



Правообладатель Издательский центр БГУ

Зусім забылася Мышка, адкуль такая чутка пайшла, абрадавалася:

— А ты не ведаеш, пернікі там ёсць? Вельмі ж пасля сыру салодкага захацелася.

— Павінны быць! — абнадзеіла суседка. — Толькі б нам не спазніцца!..

І яны кінуліся шукаць той застаўлены ежай ганак, які прыдумала Мышка, каб абхітрыць Ката.

Ах, Мышка, Мышка! Розум востры, ды памяць кароткая.

*Іван Бурсаў*

**Пара́да** — прапанова, як дзейнічаць.
**Ашука́ла** — падманула.
**Абнадзе́іла** — супакоіла, суцешыла.

?!

**1.** Ці спадабалася вам Мышка? Чым?
**2.** Раскажыце, як Мышка перахітрыла Ката.
**3.** Хто яшчэ паверыў хлусні Мышкі?
**4.** За чым пабеглі Певень, Свіння, Шарык?
**5.** Прачытайце, як адчувала сябе Мышка пасля сваёй хлусні.
**6.** Як Мышка сама сябе ашукала?
**7.** Чаму так здарылася? Адкажыце словамі з казкі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**8.** Прачытайце казку самі сабе і вызначце словы кожнага героя.

**9.** Падумайце, як іх трэба прачытаць (з просьбай, весела, з радасцю, з насмешкай, з сумам). Прачытайце казку па ролях.

ска́р-дзі-цца, у-ча-ра́ш-ня-га, вы́-ва-ра-цень, на-праст-кі́

## Разумны пеўнік

Жылі-былі дзядуля і пеўнік. Дружна жылі, у згодзе. Дзядуля каля хаты завіхаўся ды грэўся на сонейку, а пеўнік збіраў зярняткі ды весела спяваў.

Аднойчы пайшоў пеўнік пагуляць. Ішоў, ішоў і апынуўся ў лесе. Цікава там: трава высокая, дрэвы вялікія, жучкоў і казюлек розных не злічыць.

Загуляўся пеўнік, аж раптам чуе: туп-туп... Прыгледзеўся, а гэта бягуць па сцежцы воўк і ліс. Бягуць і пра нешта паміж сабой размаўляюць.

Пеўнік пад корч схаваўся, лістком накрыўся, слухае.

— Вой, як есці хочацца! — стогне воўк.

— І ў мяне жывот пусты, — скардзіцца ліс. — Нічога з учарашняга дня не еў.



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Чуў я, браце ліс, што недзе на ўзлеску хатка стаіць, а ў ёй певень і дзядуля жывуць.

— Вось бы нам да іх! — аблізнуўся ліс. — Мне б і пеўніка хапіла. Толькі дзе ж тая хатка?

— Вунь воблака плыве. Можа, яно ведае? Давай спытаем, — прапанаваў воўк.

— Давай, — згадзіўся ліс.

Воўк сеў на заднія лапы, закінуў галаву ўверх і завыў:

— Во-облака, во-облака, скажы, дзе жывуць дзядуля і пеўнік?

Але воблака не сказала, дзе шукаць дзядулю і пеўніка, хоць і ведала. Яно нахмурылася і пралілося на злыдняў дажджом. Воўк з лісам — пад вывараценъ. Сядзяць на мокрых хвастах і скавычуць. Перастаў дождж, сонейка выглянула. Падумаў пеўнік, што воўка з лісам і блізка няма, вылез са сваёй схованкі. Ускочыў на пянёк ды ад радасці як закрычыць на ўвесь лес:

— Ку-ка-рэ-ку!

* * *

Пачулі воўк з лісам — і да пеўніка. А той наўцёкі!

— Стой, певень! — хрыпатым голасам закрычаў воўк.

— Пеўнік, пачакай, — просіць ліс.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Бяжыць пеўнік па сцежцы хутка-хутка, крыламі лапоча, нагам памагае. А воўк — напрасткі, праз гушчар, каб спеваку дарогу адрэзаць.

Выскачыў пеўнік на ўскраек лесу — хата дзядулева ўжо відна, а ратунку няма: апярэдзіў яго воўк.

— Стой, певень! — крычыць. — У мяне не ўцячэш! З'ем цябе зараз! І дзядулю праглыну!

Задрыжаў пеўнік, аж прысеў ад страху і вочы заплюшчыў: не жыць яму болей на свеце.

Тут і ліс падбег:

— Адступіся, воўк, гэта мой абед!

— Чаму твой? — раззлаваўся воўк.

— Певень малы, худы, якраз мне аднаму, — сказаў ліс.

— А я галодны застануся! — зароў воўк.

* * *

Пеўнік тым часам ачомаўся ад страху.

— Не злуйся, воўк, — сказаў ён ціхім голасам, — паблізу мой дзядуля жыве. Вунь ягоная хатка пад чорным дахам. Адпусці мяне, дык я папрашу, каб ён вам добрую вячэру падрыхтаваў.

Падумалі-падумалі воўк з лісам і адпусцілі пеўніка. А вечарам прыйшлі да дзядулевай хаткі, грукаюць у акно.

— Дзед, вынось вячэру!



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Але, але, — пачуўся з хаты дзядулеў голас, — расхінайце мех, я ўкіну туды барана.

Воўк і ліс расхінулі пад акном вялікі мех. Акно расчынілася, і нешта жывое бух туды! Воўк закінуў мех на плечы і бягом у лес. Ліс за ім ледзь паспяваў.

Спыніліся, развязалі матузок. А з меха як выскачыць сабака! Ды вялізны-вялізны! Злосны-злосны! Сабака як загыркаў, як забрахаў на ўвесь лес! Воўк з лісам ад нечаканасці ледзь не папа́далі. Ім падалося, што на іх нападае страшэнны звярына.

— Вой! Вой! Ратуйце! — закрычалі яны ў два галасы і далі дзёру.

А дзядуля з тае пары стаў яшчэ больш любіць і шанаваць свайго пеўніка, бо ён жа не толькі галасісты, але і разумны.

*Уладзімір Ліпскі*

**Вы́варацень** — вывернутае з коранем дрэва.
**Скавы́чуць** — падвываюць.
**Напрасткі́** — напрамкі.
**Ачо́маўся** — апамятаўся.
**Матузо́к** — шнурок для завязкі.

?!

**1.** Ці спадабалася вам казка? Чым?
**2.** Колькі герояў дзейнічае ў ёй?



Правообладатель Издательский центр БГУ

**3.** Як жылі дзед з пеўнікам? Раскажыце.
**4.** Куды пайшоў пеўнік? Што ён там бачыў і каго сустрэў?
**5.** Чаму воблака не сказала воўку і лісу, дзе жывуць дзед і пеўнік? Прачытайце.
**6.** Як злавілі пеўніка воўк і ліс? Раскажыце.
**7.** Што прыдумаў пеўнік, каб вызваліцца?
**8.** Чаму казка называецца «Разумны пеўнік»?
* **9.** Дайце назву кожнай частцы казкі. Складзіце план для пераказу.

пад-ма́н-шчы-ца

## Падманшчыца

Воўк пытае ліску:
— Дзе была?
— Я злавіла пеўня
Ля сяла.

— Ну, а дзе ж той певень?
— З'ела ля куста.
— А чаго ж ты, ліска,
Без хваста?

— Хвост жа мне
Той певень адарваў.
— Чуў я,
Як брахаў ён:
«Гаў-гаў-гаў!»

*Аўяр'ян Дзеружынскі*





Правообладатель Издательский центр БГУ

?! **1.** Што казачнае ў гэтым творы? Растлумачце.
**2.** Якой вам уяўляецца ліска? Намалюйце яе.

ба-я-злі́-вец, паз-ба́-ві-цца, па-шка-да-ва́ў

## Жолуд-баязлівец

Прыслухаўся аднойчы дуб да ляснога шуму, акінуў позіркам неба і сказаў сваім сынам-жалудам:

— Пара́ вам у дарогу збірацца. Зараз пачнецца бура, і я падам вам каманду.

Жалуды весела загаманілі. Ім даўно ўжо хацелася хутчэй пачаць самастойнае жыццё, трапіць на зямлю, прарасці і стаць дубкамі. Толькі адзін жолуд, зірнуўшы ўніз, задрыжаў ад страху, захныкаў:

— Не шкадуеш ты нас, бацька! Вельмі ўжо спяшаешся пазбавіцца ад нас. Не хочаш, каб мы жылі з табой разам.

— Так, не хачу, — адказаў дуб. — Я хачу, каб вецер данёс вас да самай паляны. Там вам прывольна будзе жыць.

— А я не хачу нікуды ляцець.

— Паляціш, нідзе не дзенешся, — запэўніў дуб.

«Што ж мне прыдумаць?» — забедаваў баязлівец. Ён добра ведаў, што бацькава слова цвёрдае.

Тут падпоўз да яго павук-крыжавік і сказаў:



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Не бядуй, я цябе выручу. Я абкручу цябе так павуцінай, што ніякі вецер не сарве.

Павук не пашкадаваў павуціны — усю разматаў і палез хавацца пад кару. У гэты момант наляцеў вецер, секануў буйны дождж. Дуб дачакаўся самага моцнага парыву ветру і з усяе сілы страсянуў сваімі магутнымі рукамі-галінамі.

Жалуды толькі гэтага і чакалі. Яны адзін перад адным панесліся з ветрам. Хто ў шапцы, а хто і без шапкі — гэтак усе спяшаліся хутчэй трапіць на паляну.

Доўга сіратліва гойдаўся на галінцы жолуд-баязлівец. Пачарнеў увесь, патрэскаўся. Не раз пытаў яго дуб:

— Можа, нарэшце набярэшся смеласці і паляціш да сваіх братоў?

— Не, не. Я яшчэ крышку падумаю, што мне рабіць.

І дуб разгневаўся. Страсянуў ён знянацку галінаю, і баязлівец зляцеў на зямлю. Але было позна. Не змог ён прарасці.

Мінулі гады. Зазелянела паляна дубкамі, весела загаманілі яны паміж сабой. Толькі жолуд-баязлівец нічога гэтага не чуў і не бачыў.

*Іван Вярыга*



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Баязлі́вец** — які ўсяго баіцца.
**Не пашкадава́ў** — тут: многа наматаў.
**Зняна́цку** — нечакана.

**1.** Чым спадабалася вам казка? Якія пачуцці выклікала?
**2.** Якія героі ў казцы і як вы да іх ставіцеся?
**3.** Чаму дуб выпраўляў сваіх сыноў-жалудоў у дарогу ў буру?
**4.** Хто і як дапамог жолуду-баязліўцу? Прачытайце.
**5.** Ці сапраўдным сябрам аказаўся павук-крыжавік?
**6.** Прачытайце, што адбылося з братамі-жалудамі.
**7.** Чаму жолуд-баязлівец так бясслаўна закончыў сваё жыццё?
* **8.** Перакажыце казку блізка да тэксту.
**9.** Размяркуйце ролі і прачытайце казку па ролях.

**Загадка**

Малы малышак
Зваліўся з вышак.
Не так пабіўся,
Як шапачкі забыўся.





Правообладатель Издательский центр БГУ

## КАЗКІ-ЗАГАДКІ

### Брат і сястра

Жылі-былі брат і сястра. Брат быў бялявы, а сястра, наадварот, смуглявая. У брата было толькі адно сонейка, а ў сястры — месяц рагаты і тысячы зорак.

Жылі яны спачатку дружна, а потым пасварыліся. Сястра ўсё пасмейвалася з брата:

— Што ты з адным сонейкам гуляеш? Вось у мяне, бачыш, колькі зорак! З імі гуляць куды цікавей.

Маўчаў брат.

— Я згодна памяняцца з табою. Вазьмі мае зоркі, а мне сонца аддай.

— Не, сястрыца, сонейка для мяне мілей!

Пасварыліся брат з сястрою і перасталі сустракацца. Прыйдзе брат і сонейка з сабою прывядзе, а сястра ўцячэ, схаваецца. Чакае, пакуль брату не захочацца адпачыць.

Заўважыла сястра: як толькі яна прыходзіць, людзі адразу працу кідаюць, спаць кладуцца. Крыўдна ёй стала.

— Чаму ты не працуеш, калі я прыходжу? — спытала яна ў аднаго чалавека.

— Я добра папрацаваў, пакуль твой брат быў. Зараз адпачыць трэба.



Правообладатель Издательский центр БГУ



Яшчэ больш крыўдна стала сястры:

— Дык, можа, мне зусім не прыходзіць?

— Не, чаму ж! Хіба змог бы я столькі зрабіць, каб не адпачываў? — адказаў чалавек і папрасіў:

— Вы, калі ласка, заўсёды прыходзьце, толькі паасобку.

Хто з вас, дзеці, здагадаўся, як завуць брата і сястру?

*Расціслаў Бензярук*

?!

**1.** Чым цікавая казка?
**2.** Што гэта за брат і сястра?
**3.** Які быў брат і што ён любіў?



Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Прачытайце, якая была сястра, калі яна з'яўлялася.
**5.** Аб чым папрасіў чалавек сястру? Чаму?
**6.** Дайце сваю назву казцы.

## Працавітыя і дружныя

У Чалавека было дзесяць верных памочнікаў. Як пачне пра іх расказваць, не нахваліцца:

— Якія ў мяне добрыя работнікі! Усё яны ўмеюць. Трэба было — дом збудавалі. Захацеў агарод ускапаць — калі ласка! А потым і дрэвы пасадзілі.

— А ці дружна твае памочнікі жывуць? — запыталіся ў Чалавека.

— Дружней за іх у свеце не знойдзеш, — усміхнуўся той. — Кожную работу разам робяць. Адзін аднаму дапамагае. А прыходзіць зіма — дзеся́цера дзве футры апранаюць. І задаволеныя, бо разам цяплей...

А ў цябе ёсць такія памочнікі? Як іх завуць?

*Расціслаў Бензярук*

**Фу́тра** — зімовае адзенне.

?!

**1.** Якія памочнікі былі ў Чалавека?
**2.** Чым яны займаліся?
**3.** Знайдзіце ў тэксце і прачытайце, чаму ў людзей пальцы працавітыя і дружныя.



Правообладатель Издательский центр БГУ

# НЕБЫЛІЦЫ

## Сказаць навіну?

— Сказаць навіну?
— Ну?..
— Кот нядаўна з'еў ільвіцу.
— Не хачу!.. Шкада львіцы!
— Гэта ж толькі небыліца.
— Усё адно шкада львіцы.

## Ляцелі вароты...

Вароты ляцелі,
на варону селі.

*Васіль Жуковіч*

## Усмешка

У даўнія-даўнія часы на беразе сіняга мора стаяў блакітны казачны горад. Жылі ў ім шчаслівыя людзі. Удзень яны працавалі і спявалі песні, бо праца прыносіла ім радасць. А ўвечары з іхніх дамоў лілася музыка.

Пры сустрэчы людзі ўсміхаліся адзін аднаму — такое было ў іх прывітанне.

Пра тое, што на свеце ёсць горад, у якім усе людзі шчаслівыя, даведаўся злы чараўнік. Той самы, які



Правообладатель Издательский центр БГУ

ніколі не спяваў, не любіў музыкі і не ўсміхаўся. Ён рабіў толькі чорныя справы: хлусіў, прыдумваў плёткі, лаяўся.

— Я ведаю, чаму тыя людзі шчаслівыя, — сказаў сам сабе чараўнік. — Яны шчаслівыя таму, што ўмеюць усміхацца. Вось палячу я ў той горад, адбяру іхнія ўсмешкі і стану адзін шчаслівы.

Сеў ён на свой дыван-самалёт і паляцеў. Ляцеў ноччу, бо ўсе злыя чараўнікі лётаюць толькі ноччу, калі добрыя людзі спяць і бачаць светлыя сны.

Унізе паказаліся блакітныя дахі. Злы чараўнік здагадаўся, што гэта і ёсць той самы казачны горад.

* * *

Пачало світаць. З-за мора выкаціўся залаты шар сонца. Цёплыя хвалі лашчылі бераг, усыпаны гладкімі каменьчыкамі. З комінаў цягнуўся лёгкі дымок.

Седзячы за комінам, злы чараўнік чакаў, пакуль хто-небудзь не з’явіцца на вуліцы.

Нарэшце ён убачыў першага жыхара казачнага горада. Той ішоў і ўсміхаўся сонцу, якое шчодра грэла зямлю, птушкам, якія весела спявалі на дрэве, і зялёным лісточкам.

Чараўнік вылецеў з-за коміна і апынуўся перад чалавекам.



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Аддай усмешку! — крыкнуў ён страшным галасам, ад якога пасыпалася лісце з дрэў і перасталі спяваць птушкі.

Усмешка адразу знікла з твару чалавека — як яе возьмеш?

Тады чараўнік падбег да другога чалавека і гукнуў:

— Аддай усмешку!

Але зноў адабраць не змог. Яна таксама знікла.

Чараўнік паспрабаваў украсці ўсмешку, забраць яе непрыкметна, каб ніхто не бачыў. І з гэтага нічога не выйшла...

— Куплю ўсмешку, — вырашыў нарэшце чараўнік.

Але ўсе, каму ён гаварыў пра гэта, толькі паціскалі плячамі.

Чараўнік заплакаў ад крыўды. Злыя слёзы градам пакаціліся па яго шчоках.

* * *

Адзін добры чалавек пашкадаваў чараўніка, пасадзіў яго на лаўку ля блакітнага фантана, выцер ягоны твар ад слёз і спытаў:

— Чаго ты плачаш, добры чалавек?

Ніхто ніколі не звяртаўся да чараўніка з такімі словамі, і ён заплакаў яшчэ гарчэй.



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Не магу больш так жыць, — усхліпваючы, прагаварыў чараўнік, — ніхто мяне не любіць, няма ў мяне сяброў... Я хачу ўсміхацца, як усе, але не магу здабыць сабе ўсмешку.

— Усмешку не купіш і не ўкрадзеш, — сказаў жыхар казачнага горада. — Яе дораць за добрыя справы. Успомні, ці зрабіў ты сёння што добрае. У полі працаваў?

— Не, — адказаў чараўнік.

— Дом будаваў?

— Не.

— Хлеб пёк? Адзежу шыў? Можа, дзяцей добраму вучыў?

— Не, не, не, — і чараўнік нізка апусціў галаву.

Чалавек уздыхнуў:

— Дрэнныя твае справы. Але ты можаш памагчы сабе сам. Рабі дабро.

І жыхар казачнага горада пайшоў на працу.

* * *

А чараўнік сядзеў і ўсхліпваў, бо не ведаў, як яно робіцца, тое дабро.

Маленькая дзяўчынка бегла ў садзік, спатыкнулася аб каменьчык і ўпала.

Чараўнік падхапіўся, падняў дзяўчынку і стаў дзьмуць на яе пабітае каленца, каб не балела.



Правообладатель Издательский центр БГУ



Дзяўчынка, якая толькі што хацела заплакаць, раптам усміхнулася чараўніку так прыветна, што і яго губы таксама расцягнуліся ва ўсмешцы. Першы раз у жыцці!

Яму стала так лёгка, так весела, што ён пацалаваў дзяўчынку ў абедзве шчакі, сеў на свой дыван-самалёт і паляцеў рабіць добрыя справы. Цяпер ён, напэўна, стаў шчаслівым добрым чараўнікам і сам дорыць людзям усмешкі.

*Галіна Васілеўская*



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Плёткі** — непраўдападобныя чуткі, звесткі.
**Дах** — верхняя частка будынка.
**Ко́мін** —труба для адводу дыму з печы.
**Трымце́ць** — дрыжаць.

**1.** Як жылі шчаслівыя людзі?
**2.** Чаму злы чараўнік спачатку не мог здабыць усмешку?
**3.** Які быў казачны горад? За што дарылі ў ім усмешкі?
**4.** Што дапамагло злому чараўніку стаць добрым? Знайдзіце адказ у тэксце. Прачытайце.
**5.** Вызначце галоўную думку твора.
* **6.** Складзіце план казкі. Перакажыце казку па плане.
**7.** Якая з прыказак падыходзіць да казкі?
Шануй людзей, тады і цябе пашануюць.
У добрага чалавека заўсёды шмат сяброў.

Правообладатель Издательский центр БГУ



# СЦЕЖКІ ДЗЯЦІНСТВА

## Дзеці

Розныя дзеці
жывуць на планеце —
белыя,
жоўтыя,
чорныя дзеці.

Розныя дзеці —
аднолькавы смех.
Смех у хвіліны
забаў і пацех.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Розныя дзеці —
і розныя вочы.
Вочы —
як неба.
Вочы —
як ночы.

Вочы, што мора
ўвабралі глыбіні,
вочы —
пад колер
бязводнай пустыні.

Розныя вочы —
адзіныя слёзы.

Слёзы
ў хвіліны
бяды ці пагрозы.

Вось бы зрабіць,
каб на нашай планеце
гора не ведалі
розныя дзеці.





Правообладатель Издательский центр БГУ

Вось бы зрабіць,
каб у розных дзяцей
радасць гасціла
даўжэй
і часцей.

Хай жа ідуць
у сусветную шыр
Роўнасць,
Свабода,
Праца
і Мір!

*Артур Вольскі*

**Пацéха** — забава, весялосць.
**Сусвéтны** — які распаўсюджваецца на ўвесь свет.

?!

**1.** Які настрой выклікаў у вас верш?
**2.** Што аб’ядноўвае ўсіх дзяцей на планеце?
**3.** Прачытайце, з чым параўноўваюцца дзіцячыя вочы. Які колер вачэй у дзяцей?
**4.** Калі ў розных вачах «адзіныя слёзы»? Знайдзіце ў тэксце.
**5.** Што трэба для таго, каб дзеці ўсёй Зямлі былі шчаслівымі? Раскажыце.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**6.** У якіх радках верша выказана яго галоўная думка?
**7.** Як вы разумееце словы «роўнасць», «свабода»?

па-мно́-жыш, пад-лі-чы́ць, ме́с-ціць, не-паў-то́р-на-я

## Колькі раніц месціць ранец?

Як памножыш на гады
Дні і месяцы,
Тады
Падлічыць набудзеш шанец,
Колькі раніц
Месціць ранец.

Раніц многа
Ранец месціць.
Кожны дзень
І кожны месяц
Іх кіруе ў школу рана,
Каб вучыліся старанна...

Добрых раніц
Шмат у школе —



Правообладатель Издательский центр БГУ

Не забудзеш іх ніколі...
Кожнай раніцы
Усмешка
Непаўторная такая.
Да Краіны Ведаў
Сцежка
У дарогу вырастае.



Раніцы з табою ўсе —
У лістах,
Снягах,
Расе.
З іх,
Турбот і шчасця поўны,
Твой
Пачаўся
Дзень працоўны.

*Рыгор Барадулін*

**Ша́нец** — магчымасць.
**Ра́нец** — сумка, якую носяць на спіне.
**Турбо́ты** — хваляванне, клопат.

**1.** Які гэта верш (вясёлы, сумны)? Што ў ім незвычайнага?



Правообладатель Издательский центр БГУ

**2.** Прачытайце ўважліва верш. Чаму менавіта раніцы аддае перавагу паэт?
**3.** Калі раніца ў школе сапраўды «добрая»? Як аб гэтым гаворыць паэт?
**4.** Як вы разумееце выраз «кожнай раніцы ўсмешка непаўторная такая»?
**5.** Што гэта за Краіна Ведаў?
**6.** Складзіце прыказкі:
і шанцуе, працуе, таму, хто;
багацця, праца, крыніца, дружная.

за-прэ́-жа-най, ту-за-ну́-ла, а-гле́-дзе-ла-ся

## Будзень і Свята

Яны сустрэліся на дарозе. Ён у саламяным капелюшы, лапцях, з клуначкам за плячамі. Яна сядзела ў брычцы, запрэжанай параю коней, маладая і прыгожая.

Ён пакланіўся паненцы, і тая звярнула на падарожнага ўвагу:

— Хто ты? Куды ідзеш?

— Будзень я. Іду куды вочы глядзяць.

— А, цябе прагналі з сяла? — засмяялася паненка.

Ён здзіўлена паглядзеў на яе:

— Адкуль ты ведаеш?



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Я — Свята! — з гордасцю пахвалілася паненка. — Калі людзі запрашалі, я сказала, што прыйду, як цябе прагоняць.

— Ах, вось чаму ўсе раптам сталі няветлівымі! — здагадаўся Будзень. — Нават у дарогу нічога не далі.

— Ідзі-ідзі і не вяртайся! — сказала, як загадала, Свята. — Я надоўга прыехала, можа, і назаўсёды.

— Але ці можна жыць, калі кожны дзень — Свята? — засумняваўся Будзень.

— Можна! — зарагатала паненка і тузанула за лейцы.

* * *

Брычка ўехала ў сяло. Свята голасна заспявала:

Кідайце, людзі, граблі, косы —
Свята едзе ў госці!

Людзі пабеглі насустрач. Свята злезла з брычкі, агледзелася:

— А чаму няма гармоніка? Дзе дуда́?

Паслалі па музы́каў, а самі хуценька пачалі сталы́ расстаўляць, стравы насіць. Госцю на покуць пасадзілі. З’явіліся музы́кі. І развесяліліся людзі, пайшлі ў скокі.

— Як жа мы раней жылі? — здзіўляліся яны. — Усё праца ды праца.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Дзень весяліліся, пяць, месяц, аж бачаць — на сталах і ў каморы пуста. Што піць, есці? Задумаліся людзі.

— Трэба за працу брацца, — сказаў адзін са старэйшых. — Іначай з голаду памром.

— Але ж у нас Свята! — запярэчылі астатнія. — Пры такой госці мы не прывыклі працаваць. Дый Будзень невядома дзе.

— Трэба знайсці яго і папрасіць, каб вярнуўся ў сяло.

Тым часам Будзень, пахадзіўшы па свеце, дамоў ідзе. Людзі кінуліся насустрач:

— Як ты дазнаўся, што нам цяжка?

— Хто доўга гуляе, той багацця не мае! — адказаў Будзень.

Пачула гэта Свята, кінулася да брычкі і наўскач пагнала коней.

А людзі цяпер у будзень працуюць, сіл не шкадуючы, а прыйдзе свята — гуляюць. Толькі надоўга ў госці свята ўжо не прыходзіць.

*Расціслаў Бензярук*

**Капялю́ш** — тут: саламяны галаўны ўбор.
**Бры́чка** — лёгкі выязны вазок.
**Пане́нка** — маладая дзяўчына.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Тузану́ла** — рыўком пацягнула.
**Ле́йцы** — вяроўкі і рамяні, якія прызначаны для кіравання коньмі.
**По́куць** — ганаровае месца ў хаце за сталом пад абразамі.

?! 1. Хто сустрэўся ў дарозе?
2. Як выглядаў Будзень, а як — Свята?
3. Чым выхвалялася Свята? Якую песню яно спявала?
4. Раскажыце, як людзі сустракалі Свята.
5. Чаму яно хутка ім надакучыла?
6. Знайдзіце ў тэксце прымаўку і растлумачце яе.
7. Складзіце прыказку:
чалавека, праца, не паганіць, а корміць, і вучыць, і поіць.
* 8. Падзяліце казку на часткі. Дайце загаловак кожнай частцы. Коратка перакажыце казку.

**Прыказка**

Хто працуе, той святкуе.

змо́р-шчын-ках, пад-пíль-на-ва́ць,
пад-мі́р-гва-юць



Правообладатель Издательский центр БГУ

## Пра казачных чалавечкаў

Мароз намаляваў на шыбах акон свае дзівосныя белыя ўзоры, рассыпаў рознакаляровыя вясёлыя агеньчыкі. Шуміць за сцяной вецер, гудзе-падвывае ў коміне.

— Бабуля, раскажы нам казку, — просіць Зося.

— Толькі вясёлую, бабуля, такую, каб вецер перастаў скуголіць ды каб сон харошы прысніўся, — гаворыць Толік.

Бабуля адкладвае ўбок шытво. Добрая ўсмешка расплываецца ў яе тонкіх зморшчынках.

— Якую ж вам казку расказаць? — пытае бабулька. — Раскажу вам хіба пра маленькіх казачных чалавечкаў. Ну дык вось, слухайце. Жыў ды быў на свеце адзін шавец, — пачала сваю казку бабуля. — І так ён збяднеў, так збяднеў, што застаўся ў яго толькі невялікі кавалак скуры. «Выкраю я з гэтай скуры пару чаравікаў, а заўтра раніцай вазьмуся за шытво», — падумаў шавец і лёг спаць. Раніцай ён устаў і хацеў ужо за работу ўзяцца, аж бачыць — стаяць у яго на стале гатовыя чаравікі, ды такія прыгожыя, якіх ён зроду не бачыў. Прадаў шавец чаравікі і купіў на гэтыя грошы тавару, з якога скроіў аж тры пары чаравікаў. Раніцай устаў, а чаравікі зноў стаяць гатовыя. Так і пайшло з таго часу: колькі пар чаравікаў



Правообладатель Издательский центр БГУ



скроіць шавец — раніцай яны стаяць гатовыя. «Трэба падпільнаваць, хто гэта ўначы мне чаравікі шые», — падумаў шавец. Схаваўся ён за печ і чакае. І вось апоўначы з'явіліся маленькія чалавечкі, селі за шавецкі столік і пачалі шыць чаравікі. А як скончылі работу, адразу зніклі.

* * *

Шмат цікавага расказала бабулька ў гэты вечар пра маленькіх казачных чалавечкаў.



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Бабулька, а ты б хацела мець такіх памочнікаў? — запытаў Толік.

— Вядома, унучак, хацела б, — сказала бабуля...

Ле́жачы ў сваім ложку, Зося пазірала на далёкія ясныя зоркі і думала пра маленькіх казачных чалавечкаў. «А што, калі я і Толік...»

Праз хвіліну Толік ужо сядзеў побач з сястрой на яе ложку. Аб чым яны шапталіся — невядома...

А раніцою ўстала бабуля, сабралася ісці па дровы, а яны ўжо ляжаць каля печы. Хацела яна па ваду да студні пайсці — аж вада сама ў хату прыйшла: стаіць вядро на лаве поўным-паўнюткае ды сваім блакітным вокам на гаспадыню пазірае. Выйшла бабуля на ганак і вачам не верыць: нехта на сцежках снег packмятаў ды пясочкам іх прысы́паў, каб не коўзка было хадзіць. Пайшла яна пасля сне́дання па малако да суседкі, а пакуль хадзіла, нехта са стала прыбраў і падлогу падмёў.

Дзівіцца бабуля, галавой ківае, усміхаецца, а Зося з Толікам за ёю цішком назіраюць ды хітра падміргваюць адно аднаму. Цікавую гульню прыдумала Зося.

І бабуля рада, што ў яе з'явіліся маленькія казачныя чалавечкі.

*Ядвіга Бяганская*



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Шы́ба** — кусок шкла, устаўлены ў аконную раму.
**Хіба́** — магчыма.
**Чараві́кі** — абутак.
**Падпільно́ўваць** — падсцерагаць, чакаць, дачакацца.
**Сту́дня** — калодзеж.
**Гаспады́ня** — уласніца, уладарка.

**1.** Ці спадабалася вам казка, якую расказала бабуля ўнукам?
**2.** Як вы думаеце, аб чым шапталіся Зося і Толік, калі клаліся спаць?
**3.** Знайдзіце і прачытайце, што за дзівы бабуля ўбачыла раніцой.
**4.** Якую гульню прыдумала Зося? Што можна сказаць пра дзяцей, якія яны?
**5.** Знайдзіце ў казцы Ядвігі Бяганскай «Пра казачных чалавечкаў» словы, выразы, якія характарызуюць дзяцей.
**6.** Ці дапамагаеце вы сваім бацькам, бабулі? Раскажыце, што вы робіце.
**7.** Падбярыце словы з супрацьлеглым значэннем.
Добры — дрэнны.
Вясёлы — ... .
Працавіты — ... .



Правообладатель Издательский центр БГУ

Моцны — ... .
Словы-памочнікі: слабы, лянівы, сумны.

дзе-вят-на́-ццаць, за-сум-ня-ва́ў-ся

## Цяжкі выбар

Кантрольная па матэматыцы не парадавала Рыгорку. Ён рашыў задачу. Засталіся прыклады. І сярод іх той, што прынёс столькі клопату. Рыгорка аж узмакрэў, расхваляваўся. Перад кантрольнаю, здавалася, усё было зразумелым. А тут зноў заблытаўся. Лічыць так — выходзіць дзевятнаццаць, па-другому палічыць — дваццаць дзевяць.

Марына Пятроўна тым часам на гадзіннік зірнула, папярэдзіла:

— Праз пяць хвілін будзем здаваць сшыткі.

З апошняй надзеяй Рыгорка зазірнуў у Санькаў сшытак. У сябра — дзевятнаццаць. Рыгорка хуценька дапісаў у прыкладзе «дзевятнаццаць». І ў гэты час ззаду шапнуў Толя:

— Папраў на дваццаць дзевяць. Я дакладна палічыў!..

Рыгорка зноў засумняваўся. І неяк само сабою выйшла, што побач з лічбаю «дзевятнаццаць» ён дапісаў «або дваццаць дзевяць».



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Дзевятнаццаць! Вядома, дзевятнаццаць! — упэўнена даказваў на перапынку выдатнік Юрка Мудроў.

На другі дзень настаўніца раздала сшыткі. У Рыгоркі не паправіла ніводнай лічбы. Толькі ўнізе, на тым месцы, дзе павінна стаяць адзнака, напісала «8» або «7».

— Дзеці, я вам веру. Пастаўце, калі ласка, самі адзнакі ў дзённік, — папрасіла Марына Пятроўна. — Я распішуся на перапынку.

— А што мне паставіць? — пачырванеў Рыгорка.

— А ў цябе хіба няма адзнакі? — Марына Пятроўна з усмешкай паглядзела на Рыгорку. — Выбірай!

«Што ж паставіць? — гадаў Рыгорка. — Без памылак рашыў задачу, тры слупкі прыкладаў. Праўда, у канцы апошняга прыкладу не даў пэўнага адказу, як Юрка Мудроў...»

Падумаўшы яшчэ з хвіліну, Рыгорка акуратна вывеў у дзённіку сямёрку.

Марына Пятроўна ўзяла дзённік, распісалася і ціха сказала:

— Малайчына! Зрабіў правільны выбар. А сваю васьмёрку ты яшчэ атрымаеш.

*Мікола Сянкевіч*



Правообладатель Издательский центр БГУ

?! **1.** Ці спадабаўся вам Рыгорка? Чым?

**2.** Калі вы перажывалі за яго, а калі радаваліся?

**3.** Падумайце, чаму не парадавала хлопчыка кантрольная.

**4.** Якую адзнаку паставіла настаўніца Рыгорку? Чаму?

**5.** Якую адзнаку паставіў у дзённіку хлопчык?

**6.** Чаму настаўніца пахваліла Рыгорку?

**7.** Растлумачце назву апавядання.

## Параска і падказка

— Скажы, Параска,
Калі ласка,
Якую ты чытала казку?

Параска думае: «Ой, ой,
Я ж не чытала ні адной!»

Хтось шэпча ў класе:
«Курка Раба...»
Параска кажа:
«Мурка жаба».
Хтось шэпча:
«Жchanged і чапля».





Правообладатель Издательский центр БГУ

— Я помню:
«Муравей і шабля».

— Скажы, Параска,
Калі ласка,
Якіх ты ведаеш звяроў? —
Тут чхнуў яе сусед Пятроў.
Яму шапнулі:
«Будзь здароў!»
Параска, не дачуўшы слоў,
Сказала:
«Ведаю кароў».

— Вось дык цікава: звер — карова!
Скажы нам,
Без якога слова
Пражыць не можаш ані дня?
Маўчыць Параска... Цішыня...
Глядзіць яна ва ўсе бакі.
Глядзіць на столь і на падлогу:
Хто прыйдзе ёй на дапамогу?

Знайшоўся жартаўнік такі,
Што гучна прашаптаў:
«Падказка».



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Падказка! —
Крыкнула Параска.

А я не ведаю, браткі,
Ці гэта быль,
Ці гэта казка?

*Эдзі Агняцвет*

**Столь** — верхняе ўнутранае пакрыццё памяшкання, процілеглае падлозе.

?!

**1.** Ці было вам весела, калі вы чыталі верш? Чаму?
**2.** Прачытайце найбольш смешныя радкі ў вершы.
**3.** Падабаецца вам Параска? Ці хацелі б вы з ёй сябраваць?
**4.** Прачытайце, як праз сваю ляноту была пакарана дзяўчынка.
**5.** Што асуджае паэтэса ў творы?
**6.** Размяркуйце ролі і прачытайце верш па ролях. Падумайце, з якой інтанацыяй трэба чытаць пытальныя і клічныя сказы.
**7.** Складзіце прыказку:
не спадзявайся, старайся, а сам, добра вучыцца, на падказку.



Правообладатель Издательский центр БГУ

па-дда-е́-цца, пе-ра-тва-ры́-ла-ся, зме́н-шы-ла-ся

## Заўважаная памылка

Я рашаў задачы. Засталася адна. Думаў — так сабе, звычайная. Як ні біўся — не паддаецца.

З мукі́ спяклі хлеб. Па кілаграму буханка. Трэба даведацца, колькі атрымалася буханак, калі прыпёк склаў восьмую частку.

Варта мне было дайсці да слова «прыпёк», як успамінаўся прыгорак, дзе я загараў на сонцы, калі да бабулі ў вёску ездзіў у госці.

«Эх, каб зноў лета! Забрацца б на той самы прыгорак, на самы прыпёк! Бабуля смяялася, што мяне дома ніхто не пазна́е, такі чорны зрабіўся ад загару...»

Пачуўся тэлефонны званок. Я схапіў трубку.

— Санька, гэта ты?! Вось добра, што пазваніў. У цябе задача з прыпёкам атрымалася? Не? І ў мяне — не. Што? Да цябе? Лепш ты прыходзь.

Санька не прымусіў чакаць сябе.

— Чытай задачу! — загадаў ён мне.

— Ды я сто разоў чытаў.

— Ну, давай я. Значыцца, колькі атрымалася буханак, калі прыпёк... Эх, і люблю я гэты прыпёк... — Санька праглынуў слінкі. — Калі мама пасылае мяне



Правообладатель Издательский центр БГУ

па хлеб, я па дарозе ўсю буханку аб'ем. Такія смачныя гэтыя падгарэлыя скарынкі!

— І я іх люблю, — сказаў я. — Асабліва, калі добра падгарэлыя.

— Дык што ж такое прыпёк? — пачаў развaжаць Санька. — Мабыць, падгарэлыя скарынкі... Значыцца, згарэлая мука. А калі мука згарэла, уся яе вага ператварылася ў звычайны дым.

— І на адну восьмую частку зменшылася вага мукі, якая ў задачы, — падтрымаў я Саньку. — Усё проста. Хуценька падлічым.

— А ў падручніку ў адказе больш, — сказаў здзіўлены Санька.

— Што ж гэта такое? — спытаўся я.

— Нават калі вялікі пень згарае, ад яго жменька попелу застаецца! — гарачыўся Санька. — Памятаеш у лагеры наша вогнішча?

Я моўчкі кіўнуў:

— Можа, памылка?

— Відавочна памылка! — ускочыў Санька. — І не проста памылка, а заўважаная памылка...

— А што, калі мы напішам у выдавецтва пісьмо? — спытаўся Санька.

— Абавязкова напішам! — усклікнуў я. — Так і пачнём: «Заўважаная памылка».



Правообладатель Издательский центр БГУ

— І нам проста ў школу з самога выдавецтва падзяку прышлюць! — узрадаваўся Санька. — Вось гэта будзе здорава!

Санька пайшоў дамоў, а я сеў і задумаўся: «А раптам гэта не памылка?»

Дык што тады?

*Вісарыён Гарбук*

**Звыча́йны** — пастаянны, прывычны.
**Ва́рта** — неабходна, трэба, мае сэнс.
**Прымуша́ць** — патрабаваць.
**Вага́** — тут: колькасць мукі.
**Выдаве́цтва** — прадпрыемства, якое займаецца выданнем кніг.

**1.** Чаму хлопчыкі не маглі рашыць задачу?
**2.** Перакажыце апавяданне па пытаннях.
Як хлопчык рашаў задачу?
Што ўвесь час займала яго думкі?
Чаму і ў сябра Санькі задача не атрымалася?
**3.** Як вы думаеце, чаму твор называецца «Заўважаная памылка»?

## Прыказкі

Працавітаму нічога не страшна.
Дрэнныя тыя рукі, што не ведаюць ніякай навукі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

?! Прачытайце прыказкі. Якія яшчэ прыказкі пра працу вы ведаеце?

## Хвалько

Добрым быў бы хлопчык Толя,
Каб ён сціпласці меў болей.
Раз ішлі мы ў лес праз поле,
І вось так сказаў мне Толя:
— Ты павер мне, не хвалюся,
Я ні-чо-га не баюся!.. —
І якраз тады з дарогі
Толю яшчарка пад ногі.
З перапуду, у трывозе
На ўсю моц ён справіў крык,
Спатыкнуўся на дарозе —
Прыкусіў сабе язык.

Той, хто сціпласці не мае,
Хто хваліць сябе прывык,

Хай пра Толю прачытае
І прыкусіць свой язык!

*Рыгор Бойка*

**Сці́пласць** — стрыманасць.



Правообладатель Издательский центр БГУ

?! **1.** Чым выхваляўся Толя?
**2.** Прачытайце, што здарылася з Толем.
**3.** Які вывад робіць паэт?
**4.** Як вы разумееце назву верша?
**5.** Перачытайце верш. Якую рысу характару трэба выхоўваць Толю? Як гэта лепш зрабіць?

## Смяшынкі

* * *

— Ты пачаў, Ясь,
Лепш вучыцца
І як след
За кнігі ўзяўся.
— Дык ты ж ведаеш,
Бабуля,
Тэлевізар
Сапсаваўся.

* * *

— Чаго ты
Ў цёмных акулярах
Ідзеш у школу,
Ігарок?
— Каб па вачах
Не знаў настаўнік,
Што я
Не вывучыў урок.

*Аўяр'ян Дзеружынскі*

?! Што можна сказаць пра гэтых хлопчыкаў? Якія яны?

## Баязліўка

— Што хвалюешся
Ты, Люся? —
Настаўнік пытае. —



Правообладатель Издательский центр БГУ

Ці мяне ты так баішся,
Ці маіх пытанняў?

Ціха-ціха,
Неахвотна
Вымаўляе Люся:
— Вельмі ўжо сваіх адказаў
Я сама баюся.

*Аўяр'ян Дзеружынскі*

?! **1.** Чаму Люся так баіцца сваіх адказаў?

* **2.** Што трэба рабіць Люсі, каб не баяцца сваіх адказаў? Паразважайце.

## Крыўда

Вярнуўся Кастусь са школы сярдзіты і надзьмуты, як сыч.

— Ты чаго сёння такі? — спытала маці.

— Мне двойку паставілі, — адказаў хлопчык. — За ката.

— За якога ката?

— Вось за гэтага, — разгарнуў Кастусь сшытак. — А хіба я дрэнна намаляваў?

Кот сапраўды быў прыгожы. Хвост трубою, вусы белыя, поўсць, як у тыгра, паласатая.



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Добры кот, — сказала маці.

— А настаўніцы не спадабаўся. Двойку паставіла.

— Ты, можа, дурэў на ўроку малявання?

— Не, — адказаў Кастусь. — У нас сёння не было малявання. Я маляваў на матэматыцы.

*Васіль Хомчанка*

?! **1.** Які гэта твор (вясёлы, сумны, смешны, страшны)? Чаму вы так думаеце?

**2.** Чаму Кастусь быў сярдзіты? Прачытайце.

**3.** За што ён атрымаў у школе двойку?

**4.** Ці шкада вам было хлопчыка?

**5.** Прадоўжыце размову хлопчыка з маці.

## Смяшынка

Вова прыйшоў са школы раней, чым звычайна.

— Што, зноў правініўся? — пытае маці.

— Настаўніца сама вінавата. Яна сказала: паводзьце сябе, як дома. Я так і паводзіў сябе. І яна адправіла мяне дамоў.

?! **1.** Як Вова паводзіў сябе ў класе?

**2.** З чаго зразумела, што хлопчык не можа добра паводзіць сябе ні дома, ні ў школе?

**3.** А як вы думаеце, ці старанны вучань Вова?



Правообладатель Издательский центр БГУ

пры-ўзня́-ты-я, раз-гра-ба́ць,
не-за-да-во́-ле-на

## А таму!

Змітрок, Валодзя і Маня ў лес ідуць. У грыбы, мусіць. Ромка таксама ўхапіў кошык ды на вуліцу:

— І мяне вазьміце!

— Хадзем, — кажа старэйшы Змітрок. — Толькі не адставай ад нас. Каб не згубіўся часам.

— Добра, — паабяцаў Ромка, — не адстану.

Да лесу рукой падаць. Усе прама пайшлі... А Ромка бачком, бачком ды налева. Рашыў прабегчы па тых мясцінах, дзе яны з бацькам раней былі. Вось і знаёмая канаўка паўз дарогу. Ромка адразу крок прыцішыў, прыгнуўся крыху, пачаў уважліва заглядваць пад елачкі ды разграбаць прыўзнятыя лісточкі. І аж уздрыгнуў ад нечаканасці: з-пад лапак выглядаў каранасты прыгажун баравік. Ромка палюбаваўся ім, зрэзаў і паклаў у кошык. Ступіў некалькі крокаў — яшчэ адзін, азірнуўся вакол — трэці, чацвёрты!

А дзесьці ў глыбіні лесу крычалі Змітрок, Валодзя і Маня. Яго клікалі. Але Ромка не адгукнуўся. «Яшчэ сюды прыбягуць і мае баравікі пахапаюць», — думаў ён...



Правообладатель Издательский центр БГУ



Галасы Змітрака, Валодзі і Мані сталі ледзь чутныя. Ромка спалохаўся і пабег да сяброў.

— Дзе гэта ты быў? — незадаволена сустрэў яго Змітрок. — Мы ўсе ногі пазбівалі, цябе шукаючы.

— Заблудзіўся я, — зманіў Ромка і апусціў долу вочы. — Адышоў ад вас і заблудзіўся.

Падбеглі Валодзя і Маня.

— А мы цябе шукалі, шукалі, — пачала сыпаць Маня. — Думалі ўжо ў вёску бегчы ды старэйшых клікаць...



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Дадому час, — спыніў яе Змітрок і завярнуў на дарогу.

Ромку было няёмка перад сябрамі. Ён ішоў за імі, апусціўшы галаву. Але настрой яго адразу ўзняўся, калі ўвайшлі ў вёску.

— Глядзі ты, — дзівілася маці, — такі малы, а поўны кошык баравічкоў набраў. А ты, Змітрок, пэўна, варон лічыў. Толькі дно закрыў.

Хацеў Змітрок сказаць, што не да баравікоў яму было, што вось гэтага Ромку шукаў, ды змаўчаў.

Назаўтра Ромка сам да Змітрака пайшоў. Там Валодзю і Маню застаў. З кошыкамі.

— І я з вамі! — гукнуў Ромка.

— Не, — панура адказаў Змітрок, — мы цябе з сабой не возьмем.

— А чаму?

— А таму! — адказаў за Змітрака Валодзя.

*Мікола Янчанка*

**Му́сіць** — магчыма.
**Нечака́насць** — раптоўнасць.
**До́лу** — уніз.
**Няёмка** — тут: сорамна.

**1.** Ці спадабаўся вам Ромка? Чаму?



Правообладатель Издательский центр БГУ

**2.** Як вы думаеце, чаму дзеці не захацелі ўзяць Ромку другі раз з сабой? Перакажыце тэкст па плане:

1. Куды збіраліся ісці Змітрок, Валодзя і Маня?
2. Хто папрасіўся ісці з імі разам?
3. Як паводзіў сябе ў лесе Ромка?
4. Чаму толькі адзін Ромка набраў цэлы кошык баравікоў?
5. Чаму дзеці не ўзялі другі раз, назаўтра, Ромку з сабой у лес?

**3.** Растлумачце назву твора.

а-тры-ма́-е-цца, пад-а-ко́-нні-ка, а-ддзя́-чыць

## Падарунак

Вавёрачку прынёс бацька з лесу. Дзіўна, але яна адразу стала ручной — лёгка ішла на рукі, брала з далоні семкі, арэшкі, хлеб.

— Малое — дурное, — жартаваў бацька і дазволіў Івану выхоўваць яе так, як атрымаецца. Іван так і выхоўваў яе, а правільней, дазваляў ёй рабіць усё, што яна хацела.

Вавёрачка нікога і нічога не баялася — ні людзей, ні Мурзіка, ні кошкі. За лета вавёрачка вырасла, поўсць яе распушылася, стала бура-серабрыстая,



Правообладатель Издательский центр БГУ

бліскучая, а хвост што той шалік: лягла і накрылася. Іван расчыняў акно ў сад, і вавёрачка лёгка пераскоквала з падаконніка на галінкі. Але варта было Івану ціхенька пасвістаць — цю-цю-цю! — і яна зноў тут, ля акна.

З часам у вавёрачкі з’явілася тайна — яна пачала хавацца. Тут ёсць — тут няма. І ніхто, нават Іван, не ведаў яе схованкі. Вось толькі што была на вачах, а тут раз — і прапала. Можна было ператрэсці ўвесь дом, а яе не знойдзеш. Потым раз, як з неба, — скок! — і сядзіць ужо на плячы. Смех дый годзе!

Пад восень вавёрачка пачала затрымлівацца ў садзе даўжэй і даўжэй. Але Івана гэта не турбавала: нікуды не дзенецца, захоча есці — вернецца. І праўда, вярталася. Потым маці ўбачыла ў садзе не адну, а дзвюх вавёрачак: яны гулялі, скакалі адна за адной, весяліліся.

Начаваць вавёрачка прыйшла гэтым разам дамоў. Але назаўтра нанач не вярнулася. Не вярнулася яна і на другі, і на трэці дзень.

Пагараваў, пагараваў Іван і змірыўся: што ж, мусіць, вавёрачка пайшла дамоў, у свой лес. А паколькі іх бачылі ў садзе ўдзвюх, то ёй не будзе там сумна, не прападзе. Суцяшаў яго гэткімі словамі і бацька: кожны любіць волю — і чалавек, і звер.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Надышлі халады, трэба было цёпла адзявацца, і Іван успомніў пра новае паліто, што яны летам купілі разам з маці. Яно ўвесь час вісела на вешалцы за печчу.

Зняў Іван паліто з вешалкі, сунуў руку ў рукаў. Адтуль, як з мяшэчка, пасыпаліся арэхі, цукеркі, сухарыкі. «Ну і вавёрачка, ну і малайчына! — падумаў Іван. — Гэта ж, мусіць, так яна вырашыла аддзячыць за ўсё добрае, што зрабіў для яе».

Надзеў Іван паліто, павярнуўся перад маці — тая і рукамі ўспляснула. На спіне, якраз насупраць рукава, у паліто была акуратна прагрызена круглая, велічынёю з яблык, дзірка. А за ёю, у рукаве, вата, саломінкі, ніткі — сапраўднае ўтульнае гняздзечка. Дык вось куды хавалася вавёрачка, дык вось чаму ніхто не мог яе знайсці.

*Паводле Анатоля Кудраўца*

?!

**1.** Ці спадабалася вам апавяданне? Чым?
**2.** Якой вавёрачка стала за лета? Прачытайце.
**3.** Якая тайна з'явілася ў вавёрачкі? Раскажыце.
**4.** Прачытайце, што здарылася з вавёрачкай восенню.
**5.** Раскажыце, які «падарунак» знайшоў Іван у сваім паліто.
**6.** Які малюнак вам хочацца зрабіць да тэксту?



Правообладатель Издательский центр БГУ

**7.** Ці ёсць у вас якая-небудзь жывая істота? Раскажыце.
**8.** Вызначце самую галоўную рысу яе характару.

## Пераблыталіся словы

На траве
Блішчыць каса,
Свішча
Вострая раса.
Баўтануўся ў рэчцы
Шпак,
У садку
Пяе шчупак.
Узляцеў
На пеўня плот,
Збег ад мышкі ў норку
Кот.
Села кветка
На пчалу,
Спілаваў дубок
Пілу...
Пераблыталіся словы.
Хто
Разблытаць іх
Гатовы?

*Пятро Сушко*

?! **1.** Выпраўце памылкі ў вершы, каб быў зразумелы яго сэнс.
**2.** Знайдзіце ў вершы рыфмаваныя словы: *каса — раса*, ... .

## Мора

Мой найлепшы сябар Лёня
Сувенір прывёз мне з поўдня.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Ён сказаў:
— Заплюшчы вочы.
Я заплюшчыў.
— Чуеш шум?!
Мора Чорнае ракоча.
— Мора? Дзе? Шуміць чаму?
— Гэта ў ракавінцы мора.
Раз, два, вочы адкрывай!
— Лёня, праўду ты гаворыш?
Дай мне ракавінку, дай!
— На, трымай, ды асцярожна,
А то мора выліць можна.
— Лёня, мора? Дзе ж яно?
Тут вады і не відно.
— А навошта ёй тут быць —
Мора можна і ўявіць.

*Ніна Галіноўская*



**Сувені́р** — падарунак.

?! **1.** Ці спадабаўся вам верш? Чым? Якім можна назваць хлопчыка Лёню?
**2.** Навучыцеся выразна чытаць верш па ролях.



Правообладатель Издательский центр БГУ

## Хлопчык і Кацянё

Ёсць людзі добрыя, ёсць людзі злыя...
Напэўна, хтосьці з чорнаю душой
Укінуў ранняю вясной,
Калі імчалі крыгі ледзяныя,
Ў ваду сцюдзёную малое Кацянё,
І плакала яно, як дзіцянё:
— Мяў! Мяў! Ратуйце! Мяў, дапамажыце!
Мне холадна, баюся я вады...
— О, бедненькі!.. — усклікнуў хлопчык Міця. —
Трымайся, брат! Я выручу з бяды!
І мігам
Ён скочыў з берага на крыгу
І Кацянё малое ўратаваў.

* * *

Мне скажуць: — Міця так рызыкаваў...
Мажліва.
Затое ён расце адважны і чуллівы,
Таварыша ў бядзе —
Не падвядзе!

*Эдуард Валасевіч*

**Рызыкава́ў** — тут: дзейнічаў смела.
**Мажлі́ва** — магчыма.
**Чуллі́вы** — спачувальны.



Правообладатель Издательский центр БГУ

?! 1. Як вы ацэньваеце ўчынак Міці? Чаму ён ураtaваў Кацянё? Ці ўратаваў бы Міця Кацянё, калі б у першую чаргу думаў пра сябе?

2. Як вы разумееце выраз «хтосьці з чорнаю душой укінуў… у ваду сцюдзёную малое Кацянё»?

3. Што б вы сказалі такому хлопчыку пры сустрэчы?

4. Якія рысы характару мае Міця? (Спагадлівы, вясёлы, адважны, чуллівы і г. д.)

5. Ці можа хлопчык быць добрым сябрам? Чаму вы так думаеце?

6. Падумайце, якія пачуцці трэба перадаць пры чытанні верша.

* 7. Успомніце або прыдумайце прыказку пра сяброўства.

чу-ба́-цень-кі-я, сча-пі́-лі-ся, па-дзя-лі́-лі, за-ці-ка́-віў-ся, пры-гля-да́-цца

## Задзіры

Юраська сядзеў у пакоі і назіраў, як на двары, пад клёнікам, разгараецца бойка. Два чубаценькія вераб’і счапіліся, ажно пер’е ляціць з іх. І не думаюць мірыцца.



Правообладатель Издательский центр БГУ

«Можа, дурэюць? — падумаў хлопчык. — Толькі не, не падобна. Сапраўдная бойка».

Юраська ніколі не бачыў, каб біліся вераб'і. Пеўні — дык гэта іншая справа. Нездарма ў народзе кажуць: «Счапіліся, як пеўні ўсё роўна».

«Што ж яны не падзялілі?» — зацікавіўся Юраська і яшчэ пільней пачаў прыглядацца да задзіраў. Ага, вось з-за чаго бойка ўсчалася. Адзін верабей знайшоў недзе хлебную скарыначку, а другі, відаць, дужэйшы і больш нахабны, рашыў адабраць. Скарыначка ляжала побач, быццам прыз для пераможцы.

Вераб'і заўзята дзяўблі адзін аднаго. «Не, самі яны не паміракцца, — упэўніўся Юраська. — Трэба ім дапамагчы». Ён адчыніў кухонную шафку, набраў поўную жменю круп і сыпануў праз акно задзірам. Вераб'і мігам разляцеліся ў бакі, потым пасмялелі, сышліся і дружна пачалі сілкавацца. Ды так, што ажно хвосцікі ўпрысядкі захадзілі.

Юраська глядзеў на іх і радаваўся: гэта ж ён памірыў птушак.

*Васіль Ткачоў*

**Заўзя́та** — са стараннем.
**Сілкава́цца** — есці, падмацоўвацца.



Правообладатель Издательский центр БГУ

?! **1.** З-за чаго пачалася бойка ў вераб’ёў? Прачытайце, як пра гэта напісана ў апавяданні.

**2.** Як Юраська памірыў птушак?

**3.** Якую прымаўку ўспомніў хлопчык? Растлумачце яе.

**4.** Ці спадабаўся вам Юраська? Чым?

**5.** Прыдумайце сваё апавяданне «Дапамагаем птушкам» па плане:

1. Надышла зіма.
2. Замяло лясы і палі.
3. Птушкі зімой.
4. Кармушка.
5. Усе радуюцца.

## Загадкі

* * *

Шустранькі,
Маленькі,
Сам у шэрай світцы.
Шукае канапелькі,
Каб трохі пажывіцца.



* * *

Ляціць арліца па сіняму небу, крылы распластала, сонца заслала.



Правообладатель Издательский центр БГУ

## Балбатуха Міла

— Алё-алё, —
Гаворыць Міла. —
Ты, Зіна,
Пераказ зрабіла?
Зрабіла ўжо?
Я так і знала.
А я яшчэ
Не пачынала.
Лапоча зноў у трубку
Міла:
— Задачы, Оля,
Ты рашыла?
Хвалю цябе.
А я ўсё спала,
Нядаўна з ложка толькі
Ўстала.
— Алё-алё, —
Балбоча Міла, —
Урокі, Аня,
Ты вучыла?
Мыць посуд
Маме памагаеш?
Калі ты толькі паспяваеш?
І гэтак



Правообладатель Издательский центр БГУ

Лапатуха Міла
Усіх сяброўак
Абзваніла,
Вячэру смачную
Паела,
За стол рабіць урокі села.
І адзін раз
Не прачытала —
Пераказ
Убок адклала.
Узялася
За задачу —
Напаткала
Зноў няўдача:
«Адыманне
І складанне
Адкладу я лепш
Да рання».
Ранкам,
Як устала з ложка,
Паглядзела ў кнігі
Трошкі,
З'ела з кавай
Дзве аладкі
І пабегла





Правообладатель Издательский центр БГУ

На занятки.
Што было
На тых занятках,
Потым знали
Мама й татка —
Балбатуха Міла
Аж тры двойкі
Адхапіла.

*Авяр'ян Дзеружынскі*

?! **1.** Што можна сказаць пра дзяўчынку?
**2.** Прачытайце, як Міла званіла сваім сяброўкам. Чым яны ў гэты час былі заняты?
**3.** Як Міла рыхтавалася да ўрокаў? Прачытайце.
**4.** Што здарылася з дзяўчынкай назаўтра? Чаму?
**5.** Навучыцеся выразна чытаць верш, асаблівую ўвагу звярніце на пытальныя сказы.

ска́р-дзі-цца

## Яшава бяда

Яша сядзеў за сталом і чытаў кніжку. Зіна незнарок штурхнула яго, і кніжка закрылася.

— Цяпер шукай, дзе я чытаў! — сярдзіта працягнуў сястры кніжку Яша.



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Я не бачыла, на якой старонцы. Як жа я знайду?

— Як хочаш.

— Ну, добра, — згадзілася дзяўчынка, — скажы, пра што там расказваецца.

— Я не помню... Шукай.

— А як жа ты чытаў? — засмяялася Зіна і выбегла з хаты.

Давялося Яшу самому шукаць. Гартаў ён, гартаў кніжку і з пачатку, і з канца — ніяк не можа знайсці тое месца, дзе чытаў. Ледзь не заплакаў з гора. Ды ў гэты момант прыйшоў з работы бацька. Яша кінуўся да яго і пачаў скардзіцца на сястру.

— Каб не яна, колькі б прачытаў ужо! А цяпер што рабіць?

— Застаецца адзін ратунак: чытаць спачатку, — параіў бацька.

— Спачатку? — здзівіўся Яша. — Што ты, тата! Тады я не паспею сёння закончыць. І дзяўчынкі зноў будуць смяяцца, што я мала чытаю.

Бацька ўздыхнуў і паківаў галавой. Яша падумаў, што бацька спачувае яму, і таксама ўздыхнуў.

— І трэба было гэтай Зінцы падлезці. Вось бяда дык бяда!

— Сапраўды бяда... — з усмешкай сказаў бацька.

*Іван Вярыга*



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Ска́рдзіцца** — жаліцца.

**1.** Якая бяда здарылася з Яшам? Раскажыце.
**2.** Што параіў бацька сыну?
**3.** Чаму бацька ўсміхнуўся, гаворачы словы: «Сапраўды бяда...»?
**4.** Коратка перакажыце апавяданне.

* * *

Адзін — і сее, і будуе,
Гатуе, возіць, рамантуе,
Працуе рупна, без прынукі
І мае залатыя рукі.

Другі — няўмелы і няўдалы,
І абыякавы, і вялы.
Яго не радуе работа,
Бо ім валодае лянота.

*Міхась Пазнякоў*

**Ру́пна** — старанна.
**Без прыну́кі** — без прымусу.

**1.** Уважліва прачытайце верш і вызначце, як называюць аднаго і другога чалавека, пра якіх ідзе гаворка.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**2.** Пра якога чалавека гавораць, што ў яго «залатыя рукі»?

## Мой сябар

З ім я ў працы,
Адпачынку,
На ўроку,
Перапынку.
З ім я ў полі,
З ім у школе,
З ім не сумна мне ніколі.
З ім вандрую я па свеце,
З ім лятаю
У ракеце.
Чаго сам не адгадаю —
У яго я запытаю.

Ён усё на свеце знае,
Мне ва ўсім ён памагае.
З ім я гутарку вяду,
З ім нідзе не прападу.
— Хто ж ён гэтакі,
Скажы?
Нам яго ты
Пакажы.
— Незадачлівы ты,
Мішка...
Сябар мой,
Вось бачыш, ... .

*Мікола Чарняўскі*

?! **1.** Вы здагадаліся, што гэта за сябар?
**2.** Якія цудоўныя якасці мае кніжка?
**3.** Чаму хлопчык лічыць сваім сябрам кніжку? Знайдзіце адказ у вершы.
**4.** Раскажыце пра свае дзіцячыя кніжкі: пра назву кнігі, яе аўтара, аб чым твор.



Правообладатель Издательский центр БГУ

## Загадка

Белае поле, чорнае насенне, хто яго сее, той разумее.

кан-тро́ль-най, вы́-бра-цца, пе-ра-а-бу́-цца

## Сустрэча

Усе дзеці са школы пайшлі дарогай, а Саўка — нацянькі. Што яму! Праз новыя глыбокія галёшы вады не набярэш, а балота ён па жардзінках пройдзе, не зваліцца.

«Прыйду дамоў, — радаваўся хлопчык, — і адразу скажу тату: — Бяры заўтра мяне на паляванне. Дзясятка па матэматыцы. Ды якая! Па кантрольнай».

Жардзінкі аказаліся слізкімі ад ільду, і Саўка быў ужо не рад, што пайшоў сюды. Асцярожна ступаючы і балансуючы рукамі, ён павольна прасоўваўся ўперад. Раптам ля самага канца балота насустрач Саўку выскачыў суседскі сабака Тузік, з якім ён часта дурэў.

— Чаго цябе панесла сюды? Дарогі не ведаеш, ці што? — узлаваўся хлопчык. — Ага! Ніяк назад не павернешся. Вось цяпер і лезь у гразь. Бачыў, што я іду, — пачакаць трэба было.

Тузік вінавата глядзеў хлопчыку ў вочы.



Правообладатель Издательский центр БГУ



— Ну, давай назад! — загадаў Саўка.

Сабака матнуў галавой і ўздрыгнуў усім целам.

— Ведаю, як табе не хочацца лезці ў гразь, але нічога не зробіш, — ужо больш лагодна сказаў хлопчык. — Мне ніяк нельга вяртацца. Тады я тату не застану, ды і з кладкі зляцець можна. Я ледзьве сюды дабраўся.

Тузік, нахіліўшы галаву, уважліва слухаў, быццам разумеў кожнае слова.



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Ну, чаго вушы развесіў? — павысіў голас Саўка. — Давай! А то вазьму і скіну.

Хлопчык выставіў наперад рукі. Тузік прысеў на заднія лапы і жаласна заскавытаў.

Саўка задумаўся на хвіліну, уздыхнуў і рашуча ступіў у гразь.

Тузік завіляў хвастом і пабег далей па жардзінках.

— Глядзі ж, не зваліся! — крыкнуў яму наўздагон Саўка.

Ледзяная брудная вада адразу прасачылася ў чаравікі, і, каб хутчэй выбрацца на сухое, хлопчык пашлёпаў па гразі, ужо не выбіраючы дарогі.

Дома Саўка сказаў бацьку:

— Шкада мне яго стала. Сам падумай: я магу пераабуцца, на печы пагрэцца, а Тузік усю ноч будзе трэсціся ў халоднай будцы. Яшчэ захварэе.

*Іван Вярыга*

**Нацянькі́** — самым кароткім шляхам.
**Заскавыта́ў** — заскуголіў.

?!

**1.** Раскажыце, як Саўка сустрэўся з Тузікам.
**2.** Чаму Саўка ступіў у гразь?
**3.** Прачытайце, што хлопчык сказаў бацьку, калі вярнуўся дадому.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Што вы думаеце пра ўчынак Саўкі?
**5.** Што б вы зрабілі, калі б былі на месцы Саўкі? Чаму?
**6.** Ці ёсць у вас дома сабака? Раскажыце пра яго.

## Загадка

Жыве пад ганкам, хвост абаранкам, хату вартуе, з людзьмі сябруе.

зда-га-да́ў-шы-ся, ад-лі́-чва-ю-чы

## Татава аўтаручка

Сеў тата пісаць — а ручка не піша. Гукнуў тады Максімку:

— Сынок, ты маёй ручкі не чапаў?

— Не, тата, не чапаў...

— Такая харошая ручка была! Прыйдуць мама з бабуляй, трэба будзе ў іх спытаць, мо яны бралі ды незнарок сапсавалі... А ты, сынок, ідзі гуляй.

Максімка паволі пайшоў у свой пакой і гэтак жа паволі зачыніў за сабой дзверы. Тата схіліўся над сталом. Ды неўзабаве Максімка зноў прыйшоў і дакрануўся да татавага пляча:

— А калі мама тваёй ручкі не брала?



Правообладатель Издательский центр БГУ

Тата ўважліва паглядзеў на сына і, нібы аб нечым здагадаўшыся, сказаў:

— Мабыць, бабуля скінула яе са стала.

— А калі і бабуля не вінавата? — не адступаў Максімка.

— То тады і не ведаю, на каго думаць, — развёў тата рукамі. — Ты ідзі гуляй, сынок, а мне працаваць трэба.

Але хлопчык не адыходзіў. Ён пастаяў, памаўчаў, затым зноў спытаў:

— І ты будзеш на іх сварыцца?

— На каго?

— На маму і на бабулю.

Тата ледзь прыкметна ўсміхнуўся:

— Пэўна, буду. Такую добрую ручку сапсавалі.

— Шкада мамы і бабулі...

Максімка ўздыхнуў і моўчкі пайшоў у іншы пакой.

Цікаў на стале гадзіннік, адлічваючы секунды і мінуты: цік-так... Пад гэта ціканне тату добра працавалася. Ён так захапіўся работай, што не заўважыў, як зноў падышоў сын.

— Не сварыся, тата, — паціху прамовіў ён, — не сварыся на маму і бабулю... Пасварыся лепей на мяне...

*Мікола Гіль*



Правообладатель Издательский центр БГУ

?! **1.** Як вы зразумелі апошні сказ «Не сварыся, тата...»?
**2.** Чаму Максімка вырашыў прызнацца тату ў сваім учынку?
**3.** Як інакш можна назваць апавяданне?
**4.** Ці здараўся з вамі падобны выпадак?
**5.** Як вы паводзілі сябе? Ці прызнаецеся, калі зробіце што-небудзь дрэннае?

май-стэ́р-ню, па-па-ла-ска́-ла

## Чаму спыніўся гадзіннік

— Наш гадзіннік, — кажа тата, —
Нечага спыніўся.
У майстэрню трэба несці —
Мабыць, запыліўся.

— Не, няма ніколькі пылу, —
Галя адказала.
— З мылам я яго памыла
І папаласкала.

*Рыгор Бойка*





Правообладатель Издательский центр БГУ

паль-ча́т-кі, зма-ры́ць, мядз-ве́дзь, на-пат-ка́-еш, лас-ка-ве́й-ша-га

## Бабулі

— Бабкі лепшае няма,
Як мая, у цэлым свеце.
Не крычыць яна дарма,
Ласкаю прывеціць.

Звяжа цёплыя пальчаткі
Мне пад Новы год,
А калі спячэ аладкі —
Самі скачуць у рот!

— А мая бабуля казкі
Любіць баяць-гаварыць,
Цэлы вечар будзеш слухаць,
Сон не здолее змарыць:

То ў дрымучы бор заглянеш,
Дзе жыве стары мядзведзь,
То ваўчыху напаткаеш —
Уцячэш ледзь-ледзь...

Безліч казак бабка знае,
Іх заўжды ахвотна бае.





Правообладатель Издательский центр БГУ

І таму шануюць дзеці
Сваіх бабак нездарма,
Бо для іх нікога ў свеце
Ласкаве́йшага няма.

*Аўяр'ян Дзержынскі*

?! **1.** Што гаварылі пра сваіх бабуль дзеці? Прачытайце.

**2.** Як вы разумееце выраз «ласкаю прывеціць»?

**3.** Чаму кожнаму здавалася, што яго бабуля самая лепшая?

**4.** Чаму трэба шанаваць сваіх бабуль? Як вы гэта робіце?

**5.** Прачытайце верш па ролях: вызначце словы аўтара і дзяцей. Перадайце пры чытанні захапленне, любоў і павагу да бабулі.

**6.** Раскажыце пра сваю бабулю. Як вы з ёю сябруеце?

## Бабка Адарка

Ні ў кога, мабыць, няма такой бабкі, як бабка Адарка ў Алёнкі. Добрая, ласкавая, працавітая. Калі ні прыйду да Алёнкі, яна ўсё нешта робіць: то каля печы завіхаецца, то ў агародзе сее, садзіць, поле, акопвае, то ў лес у ягады ці грыбы спяшаецца. І ўсё



Правообладатель Издательский центр БГУ

быццам камусьці кланяецца, шэпча. Але і пачаставаць умее. Чаго толькі няма ў бабкі Адаркі! Морква, бручка, гарох, гуркі, памідоры, гарбузікі, арэхі... А што да садавіны, ягад розных, грыбоў... І сушаныя, і смажаныя, і вараныя, і квашаныя...

Ні ў адным агародзе так не родзіць, як у бабкі Адаркі. Што ні пасее — тое і ўродзіцца. І як, як! Гарбузы — не падняць, памідоры — з кулак, морква, бручка — з зямлі не выбраць. І калі ў лес у ягады ці грыбы бабка Адарка пойдзе — ніхто з ёю не справіцца, больш не прынясе.

— Адарка нейкія сакрэты ведае! — кажуць у вёсцы пра бабку Адарку людзі.

Неяк бабка Адарка, ідучы ў лес, і Алёнку з сабою ўзяла. І па дарозе, як і звычайна, кланялася і ўсё нешта шаптала.

Алёнка не вытрымала — спытала:

— Каму ты, бабка, кланяешся, што шэпчаш?

— Людзям, зямельцы, сонейку, — адказала бабка. — І не шапчу, а «дзякуй» кажу. Надта ж яны шчодрыя, дабром за дабро, ласкай за ласку плацяць, усё для жыцця нам даюць.

І ў лесе, калі ягады пачаліся, брала іх і ўсё кланялася, шаптала, няйнакш, кожнай галінцы, кожнай ягадцы дзякавала.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Вось якая ў Алёнкі бабка Адарка!

*Барыс Сачанка*

?! **1.** Якая бабка ў Алёнкі?
**2.** Знайдзіце ў тэксце, як апісана працавітасць бабкі Адаркі.
**3.** Што пра бабку Адарку кажуць людзі ў вёсцы? Прачытайце.
**4.** Каму бабка кланялася ў лесе і што шаптала? Прачытайце.
**5.** У чым праяўлялася дабрата бабкі Адаркі?
**6.** Складзіце план апавядання. Перакажыце апавяданне па плане.

## Жарт

У завулках
Па начах
Ходзіць Страх,
Страшэнны Страх.
А як прыйдзе
Ясны дзень,
Страх знікае,
Нібы цень.

Чалавека
Ён баіцца —
І тады яму
Не спіцца.
І са страху
Гэты Страх
Сам хаваецца
Ў лясах.

?! Ці можна перамагчы Страх? Як?



Правообладатель Издательский центр БГУ

## Каб сон не ўцёк...

— Сон прыйшоў,
Зліпае вочы.

— Спаць лажыся
Ты, сынок.
Толькі ўмыйся
Зараз, хлопча.

— Не, пасля,
Каб сон не ўцёк.

*Авяр'ян Дзеружынскі*

?! **1.** Чым спадабаўся вам хлопчык?
**2.** Чаму яго словы выклікаюць усмешку?

## Загадкі

Што для чалавека мілей усяго на свеце?
Што можна ўбачыць з заплюшчанымі вачамі?

жа́-рта-чкі, пры-ба́-ві-цца

## Дзякуй

Спякотны дзень густым блакітам вісіць над зямлёй. Жніво ў разгары.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Мы з Пятром на полі ўпершыню. Тут нас усё цікавіць. Вось дзядзька Карней грузіць снапы на калёсы. Вусы яго падобныя на спелыя жытнёвыя каласы.

— Гэй вы, басаногія! — кліча ён. — Дапамажыце снапы падносіць!

Мы стараемся. Калючая пожня драпае ногі, на тварах выступаюць кропелькі поту. Нарэшце воз нагрузілі. Дзядзька Карней увязаў яго і паехаў.

— Дзякуй, хлопцы! — гукнуў ён на развітанне.

— Эх, дзядзька, — пакрыўдзіўся Пятро, — сказаў бы «малайцы» або «расціце вялікія». А то — «дзякуй».

— А мо «дзякуй» лепш? — запярэчыў я. — Збегаем у маці спытаем.

Пабеглі і спыталі.

Маці давязала сноп, пагладзіла нашы пабялелыя на сонцы галовы і сказала: «„Дзякуй“, дзеткі, — добрае слова. Каму яго скажуць, той лішні дзень пражыве». З таго дня што мы толькі не рабілі, каб пачуць «дзякуй». Гэта ж не жартачкі! На цэлы дзень жыццё прыбавіцца.

*Мікола Янчанка*

**По́жня** — зжатае хлебнае поле.



Правообладатель Издательский центр БГУ

?! **1.** Калі адбываюцца падзеі, апісаныя ў творы?
**2.** Раскажыце, як хлопчыкі дапамагалі дарослым.
**3.** Раскажыце, як вы бавіце час у летнія канікулы.

крыш-та́ль-ну-ю, не-за-да-во́-ле-на, надзь-му́ў-ся, пра-мар-мы-та́ў

## Хто вінаваты?

Хлопчык ніяк не мог зразумець, чаго ад яго хочуць.

Што ён, урэшце, такое зрабіў? Вазу крыштальную разбіў? Ці новую мэблю цвіком падрапаў?.. Падумаеш, у абед скарыначкай хлеба запусціў у Рубіка — сабачку, якога падарыў яму тата. Ды і зрабіў гэта не са злосці. А так, каб не сумна было абедаць. Рубік забег з пакоя ў кухню, а ён — раз! — і кінуў. Вось і ўсё. І болей нічога.

Толькі дзядуля з бабуляй чамусьці адразу перасталі есці, а потым дзядуля ціха сказаў:

— Прасі прабачэння...

Хлопчык незадаволена надзьмуўся, але вылез з-за стала, падышоў да дзядулі з бабуляй і, гледзячы ў падлогу, прамармытаў:

— Даруйце... Я болей не буду...

— Не-не, — паспяшаўся спыніць хлопчыка дзядуля. — Не ў нас, а ў яго прасі прабачэння...



Правообладатель Издательский центр БГУ

Хлопчык падышоў да Рубіка, які зашыўся ў кут каля дзвярэй і вінаватымі вачыма сачыў за ўсім, што адбывалася на кухні.

— Даруй мне, Рубік... Я болей не буду...

Але дзядуля зноў яго перапыніў:

— Не-не... Ты і зараз, мусіць, не зразумеў. У хлеба прасі прабачэння... У хлеба...

І вось гэтага хлопчык ніяк не мог зразумець. Можа, ён недачуў? Ці, можа, дзядуля агаварыўся?

А дзядуля быццам здагадаўся пра яго думкі, яшчэ раз пацвердзіў свае словы:

— Так-так, у хлеба... Падымі і прасі прабачэння...

Як можна прасіць прабачэння ў хлеба? Ён жа — нежывы! Не дыхае і не размаўляе. Не смяецца і не плача... Гэта ў людзей можна прасіць прабачэння. Ну, няхай нават у жывёл, у птушак — яны таксама жывыя. А ў хлеба?.. Ён кожны дзень бачыць, як кідаюць хлеб у скрынкі для смецця, проста на зямлю, у гразь... І ніхто не просіць прабачэння. А калі так робяць, значыць, хлеб — дробязь. Усё адно як той камень ці пясок... Адным словам — мёртвая рэч! А тут — прасі прабачэння...

Хлопчык падняў скарыначку і заплакаў: ён не ведаў, за што павінен прасіць прабачэння ў хлеба.

А хто вінаваты?

*Алесь Жук*



Правообладатель Издательский центр БГУ

**1.** Прачытайце апавяданне «Хто вінаваты?»
**2.** Чым былі незадаволены дзядуля з бабуляй?
**3.** Чаму яны патрабавалі, каб хлопчык папрасіў прабачэння ў хлеба?
**4.** Як да іх патрабавання ставіўся хлопчык? Чаму ён плакаў?
**5.** Адкажыце на пытанне: «А хто вінаваты?»
**6.** Адкажыце, чаму трэба з павагай ставіцца да хлеба.
**7.** Як называюць людзей, якія вырошчваюць хлеб, выпякаюць яго?
**8.** Успомніце або прыдумайце загадку пра хлеб.

## Хлеб

Было гэта даўно. Адразу ж пасля вайны. У голад...

Маці прынесла аднекуль акрайчык хлеба. Доўга-доўга разглядала яго, нюхала, паварочвала і так, і гэтак, нібыта не верыла вачам сваім, што на далоні ў яе ляжыць хлеб — сапраўдны жытні хлеб.

Потым яна неяк, як мне падалося, аж надта борзда і неахайна разламала акрайчык напалам: адзін кавалак дала мне, а другі палажыла на стол, пад абрус.

— Гэта Толіку... Вернецца з лесу — то павячэрае...

Сама ж, узяўшы капаніцу, пайшла на агарод акопваць бульбу.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Я вельмі хацеў есці. І той кавалачак хлеба, што дала мне маці, з'еў, праглынуў мігам. І вядома, ані́ не наеўся, толькі растравіў яшчэ больш свой голад. Хвілін колькі я не мог нідзе знайсці сабе месца, чамусьці лазіў на печ, пад ложак, выбягаў на двор і зноў — каторы раз! — вяртаўся назад у хату. Потым усё ж не вытрымаў. Падсеў да стала, адгарнуў абрус, узяў у сваю руку той кавалачак хлеба, што пакінула маці Толіку, майму старэйшаму брату. Не есці ўзяў. Проста так, паглядзець. Палюбавацца хлебам, як любавалася маці. І тады раптам мне здалося, што маці мяне абдзяліла, брату пакінула хлеба намнога больш, чым дала мне. Ад братавага кавалачка я адшчыпнуў крошачку. Толькі крошачку. Адну маленечкую, малюпасенькую крошачку. Укінуў яе ў рот. Пачаў жаваць. Калі пракаўтнуў, не заўважыў, як пальцы мае самі, не пытаючыся ў мяне на тое згоды, адшчыпнулі яшчэ крошачку. Маленечкую, малюпасенькую крошачку...

Схамянуўся я тады, калі на маёй далоні асталася абшчыпаная з усіх бакоў скарыначка. Што я нарабіў? Што скажуць маці, брат, калі вернуцца дахаты?..

Хуценька-хуценька я палажыў скарыначку на стол, акрыў яе абрусам. Але спакуса з'есці хлеб увесь, каб яго і духу не было ў хаце, каб ім і не пахла нават, была такая вялікая, такая неадольная, што я не



Правообладатель Издательский центр БГУ

вытрымаў — зноў падсеў да стала, узяў скарыначку ў рукі і ўкінуў яе ў рот...

* * *

Брат вярнуўся з лесу, як заўсёды, позна... Ён цэлы дзень быў на дзялянцы, абсякаў суччa, зарабляў грошы, каб было за што нашай сям'і жыць. Дома есці ў нас не было нічога. І спаць брат лёг у той вечар галодны. Ён доўга варочаўся на пасцелі, не засынаў: няйнакш яму мроіўся той кавалачак хлеба, які пакідала яму маці і які з'еў я...

Ніхто — ні маці, ні Толік — ні ў чым мяне не папракнулі. Ні ў той вечар, ні пасля. Яны былі старэйшыя, я меншы.

Але калі я цяпер успамінаю той хлеб, які належала з'есці брату і які з'еў я, і той вечар, калі брат лёг праз мяне спаць галодны, мне робіцца не па сабе. Здаецца, аддаў бы ўсё, каб толькі не было ў мяне такога ўспаміну, каб як-небудзь пазбыцца, выкінуць яго са сваёй галавы. Лепей бы я быў тады галодны, лепей бы я лёг спаць не еўшы! Хай бы не я, а брат з'еў мой хлеб!..

Ды не! Таго, што было, не вернеш, не пераробіш. І з памяці сваёй, як бы ні хацеў, не выкінеш. Не, не выкінеш!..

*Барыс Сачанка*



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Бо́рзда** — хутка.
**Абру́с** — кавалак тканіны, якім засцілаюць стол.
**Капані́ца** — прылада, якой капаюць зямлю.
**Схамяну́цца** — спахапіцца.
**Спаку́са** — тое, што вельмі вабіць чалавека, выклікае неадольнае жаданне.
**Мро́іцца** — уяўляцца ў думках.

**1.** Калі адбываліся падзеі, апісаныя ў апавяданні?
**2.** Як вы разумееце слова «голад»?
**3.** Чаму маці падзяліла хлеб на дзве, а не на тры часткі?
**4.** Што зрабіў хлопчык? Чаму гэты ўчынак хвалюе яго ўсё жыццё?
**5.** Чаму дарослыя не дакаралі малога?
**6.** Як трэба адносіцца да хлеба?

## Хлебная скарынка

Пахне хлебная скарынка
Цёплым ветрыкам,
Хваінкай,
Летнім дожджыкам
Грыбным,
Лугам,





Правообладатель Издательский центр БГУ

Полем аржаным
І асенняй пазалотай
Ды натхнёнаю работай.
*Аўяр'ян Дзержынскі*

**Натхнёны** — захоплены, радасны.

Вывучыце верш на памяць.

штур-ха-нýў-шы, пра-шмы-гнýў

## Нарэшце зразумеў

Маці паслала Цімку купіць батон. Каля самага магазіна ён дагнаў незнаёмага дзядулю. Не паспеў стары пераступіць парог, як Цімка, штурхануўшы яго, прашмыгнуў наперад. Стары лёгенька, але з яўным намёкам, стукнуў Цімку кійком па спіне.

Хлопчык азірнуўся: за што? А дзядуля, не хаваючы хітрынкі ў вачах, моўчкі пайшоў да прылаўка.

Вярнуўшыся дамоў, Цімка расказаў маці пра здарэнне ў магазіне.

— Цікава, — усміхнулася маці.

— Што цікава? — перапытаў Цімка.

— Ды тое, што з табою адбылося.

— Чаго ж той дзед мяне зачапіў?



Правообладатель Издательский центр БГУ

— А ты не зразумеў?

— Не...

Маці хацела, каб Цімка сам пра ўсё здагадаўся. Але той маўчаў.

— Крыўдна мне за цябе, сынок.

— Чаму?

— Што ты такі някемлівы...

Цімка ледзь не плакаў: ён нічога не разумеў.

Тады маці сказала:

— Ты, сынок, пакрыўдзіў старога чалавека. Павінен быў прапусціць дзядулю першым. Трэба дарослых, асабліва старэйшых, паважаць.

— А-а, — нарэшце зразумеў Цімка.

*Павел Кавалёў*

**Някéмлівы** — нездагадлівы.

**1.** Перачытайце апавяданне самі сабе.
**2.** Куды і за чым паслала маці Цімку?
**3.** Што здарылася з хлопчыкам каля магазіна?
**4.** Чаму дзядуля стукнуў Цімку кійком па спіне?
**5.** Чаму маці назвала сына някемлівым?
**6.** А як яго можна назваць яшчэ?
**7.** Што трэба запомніць Цімку з гэтай гісторыі? Знайдзіце ў тэксце.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**8.** А як яшчэ можна праяўляць сваю павагу да старэйшых?
**9.** Дайце сваю назву апавяданню.

## Самае добрае

*Балгарская народная казка*

Жыў-быў вельмі мудры чалавек. Была ў яго дачка — малая дзяўчынка. Жылі яны ў прыгожым, вялікім доме. А каля дома быў сад, поўны кветак. З раніцы да вечара малая дзяўчынка гуляла ў садзе альбо бегала па пакоях дома. Толькі ў адзіны пакой яна не ўваходзіла, таму што ён заўсёды быў зачынены.

Аднойчы дзяўчынка пачала ўпрошваць мудраца:

— Дазволь мне, тата, зірнуць на пакой! Ён, напэўна, самы добры.

— Там сапраўды за дзвярамі ляжыць самае добрае, — адказаў бацька. — Але ты яшчэ зусім маленькая. Вось калі вырасцеш, я дам табе тое, што там захоўваецца. І падарунак гэты будзе радаваць цябе ўсё жыццё.

Расла дзяўчынка і вырасла. Даў ёй мудры чалавек залаты ключ ад таго пакоя. Пабегла яна, адчыніла дзверы, і што ж яна ўбачыла? Прасніцу, верацяно і разгорнутую кнігу.



Правообладатель Издательский центр БГУ



Больш нічога ў пакоі не было.

Пайшла дзяўчынка да бацькі і сказала яму праз слёзы:

— Ты, бацька, мне казаў, што ў гэтым пакоі знаходзіцца самае лепшае, а я там знайшла толькі прасніцу, верацяно і кнігу.

— Але ж гэта, дачка мая, і ёсць самае лепшае, — адказаў ёй мудры чалавек. — Прасніца і верацяно — гэта праца, а кніга — вучэнне. Лепш за іх няма нічога на свеце. Усё добрае на свеце дасягаецца толькі працай і ведамі.

**Пра́сніца** — прыстасаванне для прадзення.
**Верацяно́** — прылада для намотвання ніткі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

?! **1.** Ці здзівіла вас казка? Чым?

**2.** Чаму мудрэц не дазволіў зайсці ў пакой маленькай дзяўчынцы? Як аб гэтым гаворыцца ў казцы? Прачытайце.

**3.** Што ўбачыла дзяўчынка ў таямнічым пакоі?

**4.** Знайдзіце ў казцы прымаўку.

**5.** Прыдумайце свае прымаўкі пра працу і вучэнне.

**6.** У чым бачыў сэнс жыцця мудры чалавек?

**7.** Перакажыце казку блізка да тэксту.

## Дарэмная праца

Носіць курачка ваду,
Палівае лебяду.
Падышла паважна качка:
— Траціш час дарма, дзівачка.
Лепш пасеяла б ячмень —
Ела б зерне кожны дзень.

*Ніна Галіноўская*

?! Якім можна назваць верш (смешным, забаўным, гумарыстычным, сумным, вясёлым)? Чаму?

## Прыказкі

Папрацуеш да поту і з'ясі ў ахвоту.
Добра працуеш — павагу маеш.

Правообладатель Издательский центр БГУ



# ВЯСНОВА-ЛЕТНЯЯ СТАРОНКА

Багата вясна кветкамі, а лета — гульнямі.

## Жавароначкі, прыляціце

Жаўрукі — найпершыя пасланцы вясны. На Беларусь яны вяртаюцца з выраю ў сярэдзіне сакавіка. Сонца яшчэ не паспела злізаць снег. Раніцою і ўвечары кусаецца мароз. А жаўрукі пяюць ужо, звіняць над полем і лесам, над вёскамі і гарадамі, вітаюць прыход вясны.

Іх у дружнай жаўруковай сямейцы — чатыры родныя браты.

Палявы.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Лясны.

Чубаты.

Рагаты.

Не бойцеся, у апошняга з братоў зусім не страшныя рожкі. Проста ў яго на галоўцы тырчаць пярынкі. Імі не надта напалохаеш драпежнага ястраба. Але жаўручок, як расказваюць старыя людзі, паднімецца з саломінкаю ў неба і спявае: «Пайду ястраба біць! Пайду ястраба біць!..»

Ды вось бяда — саломінка выпадае, і жаўрук каменем ляціць да зямлі. А па дарозе апраўдваецца: «Кій упаў! Кій упаў!..»

Цяжка жаўруку несці на малых крылах званочкі вясны. Але можна дапамагчы ім. Трэба папрасіць маму, каб яна напякла з цеста чубаценькіх пташак. Потым нядзелькаю выйсці на вуліцу, як мага вышэй падкідваць іх угору над сабою і спяваць:

— Жавароначкі, прыляціце,
Цёпла лецейка прынясіце!
Бо зімачка надаела,
Усе хлебушкі пераела!

Паспрабуй, мой маленькі сябар. І ты абавязкова, хоць на адну хвіліну, наблізіш прыход вясны-красны на родную зямлю.

*Уладзімір Ягоўдзік*



Правообладатель Издательский центр БГУ

?! **1.** Пра што новае, цікавае вы даведаліся з апавядання Уладзіміра Ягоўдзіка «Жавароначкі, прыляціце»?
**2.** Як пісьменнік называе жаўрукоў? Чаму?
**3.** Якія бываюць жаўрукі? Прачытайце.
**4.** Якія словы спявае жаўрук? Знайдзіце ў тэксце.
**5.** Што характэрна для першых пасланцоў вясны?
**6.** Прачытайце, як можна прыблізіць вясну.
**7.** Паспрабуйце намаляваць жаўрука.

## Пралеска

Прыгрэла сонейка.
На ўзлеску
Птушыны спеў
Чуваць здаля...
Стаіць і слухае пралеска,
Як ціха дыхае зямля.

*Аўяр'ян Дзеружынскі*



?! **1.** Уявіце карціну, апісаную ў вершы. Што вы намалюеце?
**2.** Як вы разумееце словы «дыхае зямля»?
**3.** Вывучыце верш на памяць.



Правообладатель Издательский центр БГУ

## Вожык і ручаёк

Восенню, калі пахаладала, знайшоў вожык у глухой мясцінцы трухлявы пень, зрабіў у ім гняздо з лісця і заснуў.

Доўга спаў вожык ці не, сам не ведае. Але аднойчы пачуў, што нехта трывожыць яго: усё бубніць і бубніць непадалёку.

Высунуў пыску з гнязда, глядзіць — ручаёк весела журчыць.

— Прачнуўся сам і іншых будзіш, — папракнуў вожык. — А я не выспаўся яшчэ, ручаёк.

І зноў у гняздо паціснуўся, заснуў. Раніцаю вочкі расплюшчыў і зморшчыўся, быццам горкую пілюлю праглынуў. Увесь бачок — мокры.

Вылез з гнязда і бачыць: ручаёк пашырэў, да самага пня падступіўся.

— Ну, пачакай, назола! — зазлаваў вожык. — Я цябе зямлёю засыплю!

Хуценька перабіраючы ножкамі, падбег да ручайка, а той падхапіў яго і панёс.

Плыве вожык, ніяк да беражка прыстаць не можа.

А наўкола — вясна. Лёгкі туманок над зямлёю сцелецца. Падбел расцвіў, пралескі яснымі вочкамі ўсміхаюцца. У сінім небе жаваранкі спяваюць.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Вожык і пра злосць сваю забыўся. Выбраўся з вады на беражок, сказаў:

— Дзякуй, ручаёк! Каб не ты, я і вясну праспаў бы.

*Янка Галубовіч*

?! **1.** Які настрой выклікала ў вас казка?

**2.** Перачытайце яе, знайдзіце незразумелыя словы. Падумайце, што яны азначаюць.

**3.** Чым быў незадаволены вожык?

**4.** Раскажыце, чаму спачатку вожыку не спадабаўся ручаёк.

**5.** Што зрабіў ручаёк? Прачытайце.

**6.** Што ўзрадавала вожыка?

## Загадкі

* * *

Не званочак,
А звініць.
Ног не мае,
А бяжыць.
Як гарэза,
Скок ды скок:
Ён вясёлы... .





Правообладатель Издательский центр БГУ

* * *

Паўзун паўзе, іголкі вязе.

## СКОРАГАВОРКІ

### Сакавік

Люты ўцёк,
люты знік.
І пацёк
снегавік.
Дзе твой сок,
сакавік?

### Красавік

Красавік у родным краі
Краскі яркія збірае.

### Травень

Травень вырасціў траву.
Я траву кароўцы рву.

*Васіль Жуковіч*

?! **1.** Пра якія месяцы гаворыцца ў скорагаворках? Чым асаблівы кожны месяц?
**2.** Навучыцеся хутка чытаць скорагаворкі.
**3.** Выкарыстоўвайце іх у сваіх гульнях.



Правообладатель Издательский центр БГУ

## Кветкі



Рамонак



Ландыш



Дзьмухавец

?! **1.** Што пераблытана ў назвах кветак? Назавіце правільна.

**2.** Раскажыце, якая з намаляваных кветак вам больш падабаецца. Чаму?

ле́-таш-няй, а-зір-ну́-ла-ся, вы́-гля-ну-лі, пя-лёс-та-чак, за-кра-су́-еш, раз-ля-ці́м-ся, дзьму-ха-ве́ц

## Дзеці на парашутах

Вясною, як толькі прыгрэла сонейка, яна першаю выглянула з сухой леташняй травы і адразу расцвіла жоўтым цветам. Азірнулася вакол, бачыць: выглянулі



Правообладатель Издательский центр БГУ

з травы і расцвілі іншыя кветкі — маленькія жоўтыя сонейкі.

— Гэта мае сваякі, — сказала кветка, і ёй стала радасна, што яна не адна на свеце.

Але з кожным днём прыгравала сонейка, і кветка пачала сівець. Замест жоўтай зрабілася белай-белай.

— Што ж цяпер будзе? — спалохалася яна, бо ўбачыла, што ўсе яе сваякі таксама белыя. Чуе кветка — ляціць цяжкі касматы чмель. Яна ведала гэтага чмяля. Ён часта лятаў тут і гудзеў сваім тоўстым голасам, збіраў мёд і ніколі не мінаў яе пялёстачкаў.

— Што будзе? — трывожна спыталася кветка. — Няўжо я загіну і загіне ўся мая радня?

Мудры чмель ёй сказаў:

— Не палохайся. На той год закрасуеш зноў. Толькі трэба зрабіць так, каб твае дзеці разляцеліся як мага далей.

— А як мы разляцімся? У маіх жа дзетак няма крылаў.

Мудры чмель думаў-думаў і нічога не прыдумаў.

— Думай сама, — сказаў ён. Загуў, як самалёт, і паляцеў.

Доўга думала кветка-дзьмухавец і нарэшце радасна ўсклікнула:



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Прыдумала! І пачала кветка-маці шыць сваім дзеткам белыя шаўковыя парашуцікі. І толькі дзьмухнуў ветрык, паляцелі сынкі і дачушкі — кожны на сваім белым парашуціку. Хто дзе ўпаў — там і заснуў да будучай вясны. А як толькі пасля зімы прыгрэла сонейка, прачнулася маці, глянула — а навокал жоўта ад кветак.

— Як я добра прыдумала! — радасна сказала кветка-маці.

*Васіль Вітка*

?! **1.** Пра каго расказваецца ў казцы?
**2.** Калі адбываюцца падзеі, апісаныя ў ёй? Знайдзіце ў тэксце і прачытайце.
**3.** Чаму хвалявалася кветка-дзьмухавец?
**4.** Што параіў ёй чмель? Раскажыце.
**5.** А што прыдумала яна сама? Прачытайце.
**6.** Размяркуйце ролі і прачытайце казку па гэтых ролях.

## Як сеялі абаранкі

Мы за вёскаю гулялі.
Там два трактары аралі.
— Будзем сеяць абаранкі, —
трактарысты нам сказалі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

А Іванка засмяяўся:
— Цётка Ганка, дзядзька Вася!
Я сам бачыў — мама ўранку
пякла ў печы абаранкі.

Дзядзька ж Вася, цётка Ганка
запыталіся ў Іванкі:
— А з чаго, скажы, Іванка,
пякла мама абаранкі?

А Іванка, хлопчык смелы,
адказаў на гэта ўмела:
— З цеста круцяць абаранкі...
Тры мяхі мукі ў нас белай.

Трактарысты ж зноў спыталі:
— А мукі дзе вы дасталі?
Можа, ты ў сваім млыночку
намалоў яе з пясочку?
— Не з пясочку, а з зярнятак
намалоў мукі мой тата!

— Маладзец! — сказалі Янку
дзядзька Вася, цётка Ганка. —
Але ж дзе раслі зярняты,
не пытаўся ты ў таты?



Правообладатель Издательский центр БГУ

— На палях, дзе спее колас! —
мы гукнулі ў адзін голас. —
Дзядзька Вася, цётка Ганка,
хутчэй сейце абаранкі!

*Іван Муравейка*

?! **1.** Прачытайце верш самі сабе. Ці можна пасеяць абаранкі? З чаго іх вырабляюць? Знайдзіце адказ у тэксце.

**2.** Прачытайце, адкуль бярэцца мука для абаранкаў.

**3.** Падрыхтуйцеся да выразнага чытання: не забывайце пра клічныя і пытальныя сказы.

ці-ка́-ва-сцю, па-гля-дзе́-ла, ня-шча́-сна-я, за-кру-жы́-ла-ся, а-пу-сці́-ла-ся, не-пры-кме́т-на-я, здзі-ві́-ла-ся, да-кра-ну́-ла-ся

## Фіялка

Увесну пад старою ліпаю расцвіла маленькая Фіялка. Яна з цікавасцю паглядзела навокал і ўбачыла, што ўсе яе суседкі яркія і высокія і над імі кружацца прыгожыя матылькі. А да яе, маленькай кветкі, ніхто не прылятаў, і яна самотна цвіла ў густой траве.



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Ах! — жаласна ўсклікнула Фіялка. — Чаму я такая няшчасная? Ні адзін матылёк не можа знайсці мяне. Лепш бы я зусім не цвіла.

І раптам яна пачула прыемнае гудзенне... Гэта Пчала закружылася над ёю і апусцілася на сінія пялёсткі.

— Як ты мяне знайшла? — спытала радасна кветка. — Я ж такая маленькая і непрыкметная!

— У цябе цудоўны пах, — прагула Пчала.

— Няўжо? — здзівілася Фіялка. — Нават лепшы, чым у тых жоўтых?

— Лепшы. Ты самая цудоўная з ранніх кветак. І я часта буду прылятаць да цябе.

Пчала дакранулася да кветкі, узяла кропельку нектару і паляцела ў вулей.

І маленькая Фіялка яшчэ больш расцвіла, павесялела. Яна адчула сябе самай шчаслівай на веснавой зямлі. Пчала абмінула многія яркія высокія кветкі, а знайшла яе, маленькую, непрыкметную, у траве.

*Клаўдзія Каліна*

**Само́та** — адзінота, смутак, туга.

?!

**1.** Ці спадабаўся вам твор? Чым?

**2.** Як вы думаеце, гэта казка ці апавяданне? Чаму?



Правообладатель Издательский центр БГУ

**3.** Чаму Фіялка лічыла сябе няшчаснай? Знайдзіце ў тэксце і прачытайце.
**4.** Калі Фіялка адчула сябе «самай шчаслівай»? Раскажыце, а потым прачытайце.
**5.** Паспрабуйце словамі намаляваць гэтую кветачку. Якія словы вы выкарыстаеце? Якога колеру яна будзе?
**6.** Перакажыце твор падрабязна.

вер-ба-ло́-зі-ны, за-шча-бе́-ча

## Перасмешнік

Ходзіць Май па гаі ды на скрыпачцы грае, а вакол птушкі на розныя галасы спяваюць. Радасна ім, што вярнуліся з выраю на радзіму. Адзін дрозд маўчыць.

— А ты чаму не спяваеш? — здзівіўся Май.

— Я спяваў бы... — сумна адказаў дрозд. — Ды песня мая непрыгожая: цінь-цілінь — і ўсё. Можа, мне ў другіх птушак павучыцца?

— Што ж, павучыцца можна. Ды толькі глядзі, каб свае песні не забыў.

Але дрозд ужо не чуў таго, што сказаў Май. Паляцеў да шпакоўні.

— Шпачок-браток, навучы мяне спяваць!

— Калі ласка, паўтарай за мной!



Правообладатель Издательский центр БГУ

Паўтарыў дрозд шпачыную песню і паляцеў далей.

Высока ў небе жаўрук вызвоньвае. Дрозд — да яго:

— Братка, навучы мяне спяваць па-твойму!

— Калі ласка, вучыся, калі маеш ахвоту!

Праспяваў дрозд услед за жаўруком некалькі яго пералівaў — добра выходзіць!

Чуе — ластаўка шчабеча. Ды так звонка, так залівіста.

Пераняў дрозд і ластаўчын спеў.

Пасля да салаўя паляцеў.

А салавей на ўвесь гай расспяваўся. Дрозд сеў побач на чаромсе, слухаў, слухаў — і раптам як зацёхкае сам! Ну, зусім як салавей.

— Навучыўся! — зарадаваўся дрозд. — Калі я ўжо і салаўём пяю, дык мне больш вучыцца не трэба!

Прыляцеў ён да сваёй вербалозіны, пакалыхаўся на ёй і давай спяваць. Што гэта быў за спеў! То шпаком пасвішча, то жаўранкам зазвініць, то ластаўкай зашчабеча, то салаўём зацёхкае, а сваёй песні і не ўспомніў.

Паслухаў дразда Май і кажа:

— Ох і майстар! Чужое пераняў, а сваё дзе? Забыўся?



Правообладатель Издательский центр БГУ

Так і спявае дрозд з таго часу на ўсе птушыныя галасы і ўсё чужыя песні... І завуць яго людзі за гэта драздом-перасмешнікам.

*Клаўдзія Каліна*

?!

**1.** Ці спадабалася вам казка? Чым?
**2.** Чаму пісьменніца піша: «Ходзіць Май па гаі...»? Як гэта адбываецца?
**3.** Пра што расказаў Маю дрозд?
**4.** Якую параду ён атрымаў?
**5.** Раскажыце, як дрозд вучыўся спяваць і што з гэтага выйшла.
**6.** За што людзі завуць дразда перасмешнікам? Прачытайце.
* **7.** Перакажыце казку падрабязна.

у-зы-хо́-дзіць, сы-ра-е́ж-ка-мі

### Лета

Прыходзіць лета звонкае
Птушынаю гамонкаю,
Над сінімі азёрамі
Яно ўзыходзіць зорамі,
А пахне медуніцамі
І спелымі суніцамі.



Правообладатель Издательский центр БГУ



Прыходзіць лета сцежкамі
З малінай, сыраежкамі,
Частуе на пагорку
Арэхамі вавёрку,
На возеры, ля берага,
Гукае зайца шэрага...

Куды ні глянь — усюды
Цябе чакаюць цуды,
Цябе чакаюць сцежкі
І радасныя ўсмешкі,
Лугі, лясы, палі
І шчасце на зямлі.

*Сяргей Грахоўскі*

?! **1.** Пра лета паэт гаворыць як пра жывую істоту. Якія словы дапамагаюць уявіць лета жывым? Знайдзіце іх у тэксце.

**2.** Што прыносіць лета? Чым яно пахне? Прачытайце.

**3.** Да чаго заклікае паэт? Знайдзіце ў вершы і растлумачце.

**4.** Прачытайце верш выразна. Падумайце, які настрой трэба перадаць пры чытанні, якія словы вылучыць голасам.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**5.** Як вы праводзіце лета? Чым займаецеся? Раскажыце.

## Чэрвень і Сонейка

Бегае Чэрвень з самага ранку і да вечара па садах, палях. Усюды трэба паспець, усё дагледзець.

Не паспеў аббегчы ўсе сады, паглядзець, ці добрая завязь на дрэвах, як на поле ўжо трэба — на жыта зірнуць, падцягнуць лён, каб даўжэйшы рос, папрасіць ветра, каб прыгнаў хмару з дажджом ды астудзіў ад спякоты зямлю... А тут яшчэ трэба ў лес завітаць, дагледзець сунічкі і іншыя ягады, павярнуць іх да Сонейка, каб сокам наліваліся. А Сонейка ўжо на заходзе, хутка вечар...

— Ох, які кароткі дзень! — скардзіцца Чэрвень. — Сонейка, памажы мне, свяці даўжэй.

Сонейка слухаецца Чэрвеня і кожны раз усё павялічвае дзень.

Чэрвень за дзень усюды пабывае: паглядзіць, як у лесе даспяваюць сунічкі, загляне ў вожыкаву схованку, пацікавіцца, як гадуюцца там малыя, і ў гнёзды птушыныя зазірне. Так за турботамі і не заўважае, як бяжыць час.

І вось чуецца звон кос на лузе: пачалася касавіца... Новыя ў Чэрвеня клопаты.



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Сонейка, будзь ласкава, павяліч яшчэ дзень! Людзям сена трэба высушыць! — просіць зноў Чэрвень.

Сонейка слухала Чэрвеня, павялічвала дзень, павялічвала ды і кінула.

— Хопіць! — кажа. — Болей не магу даць ні хвілінкі... Ночка крыўдзіцца, зусім кароценькая стала. Не паспее пацямнець неба на захадзе, як ружавее на ўсходзе!

— І за гэта дзякуй! — кажа Чэрвень. — І так ты мне памагло. Я і садавіну падгадаваў, і ягады сокам наліў... І шмат іншае работы зрабіў. Не сорамна будзе майму брату Ліпеню ў вочы глянуць!

Вось чаму ў Чэрвеня самы доўгі дзень і самая кароткая ноч. Гэта Сонейка дружыць з Чэрвенем і дапамагае яму.

*Паводле Клаўдзіі Каліны*

?!

**1.** Якія пачуцці, думкі ўзніклі ў вас пасля чытання твора?

**2.** Месяц Чэрвень паўстае як жывы. Чаму?

**3.** Што кожны раз прасіў Чэрвень у Сонейка? Пра каго клапаціўся?

**4.** Раскажыце, як сябравалі Сонейка і Чэрвень.

**5.** Чаму ў Чэрвеня самы доўгі дзень і самая кароткая ноч?



Правообладатель Издательский центр БГУ

## Загадка

Глянеш — заплачаш, а ўсе яму рады.

зай-здро́-сна, не-звы-ча́й-на-я,
ся-мі-ко́-лер-на-я

## Як рабілі вясёлку

Пры азярыне між кветак і траў гулялі ў хованкі праменьчыкі. Іх было аж сем — Фіялетавы, Сіні, Блакітны, Зялёны, Жоўты, Аранжавы і Чырвоны. Раптам праменьчык Фіялетавы сказаў:

— Надакучыла тут. Хачу на другі бераг азярыны!

Абапёрся адным канцом на купіну, выгнуўся дугою, другі канец апусціў на процілеглы бераг і засвяціўся ад радасці.

Убачыў праменьчык Сіні, як брат ягоны раскашуе, і таксама сказаў:

— На той бераг хачу!

Пераскочыў азярыну, далучыўся да Фіялетавага, і ўжо на пару заззялі яны над зямлёю.

Зайздросна стала праменьчыку Блакітнаму, і ён, доўга не думаючы, кінуўся да братоў.

У небе цяпер тры стужачкі каляровыя гарэлі. Праменьчык Зялёны не вытрымаў, шугануў увысь і адтуль гукнуў:



Правообладатель Издательский центр БГУ



— Гэй, там, на зямлі! Да нас гайда! Тут прасторна! І відаць далёка!..

Праменьчык Жоўты павагаўся, а тады ўзяў і таксама пераскочыў азярыну. І атрымаўся ладны паясок — пяціколерны.

«А я хіба горшы?» — падумаў іх брат Аранжавы і кінуўся следам.

У небе ўжо гарэў шасціколерны паясок. Бачачы такое дзіва, праменьчык Чырвоны сказаў:

— Браты, а мяне прымеце ў сваю кампанію?



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Прымем! Прымем! — пачуліся галасы. — Не марудзь толькі...

Праз хвіліну ў небе над азярынай павісла незвычайная сямікалерная стужка. Радавалася ёй усё жывое на зямлі. А паколькі стужка гарэла весела, то людзі і назвалі яе «вясёлка».

*Яраслаў Пархута*

**Раскашу́е** — добра жыве.

**1.** Прачытайце казку самі сабе.
**2.** Чым займаліся праменьчыкі? Якога колеру яны былі?
**3.** Якую новую гульню прыдумаў Фіялетавы праменьчык і чым яна закончылася?
**4.** Чаму калі праменьчыкі разам сабраліся, то іх сталі называць «вясёлка»?
**5.** Ці бачылі вы вясёлку? Раскажыце пра гэта.
* **6.** Прыдумайце самі загадку і прымаўку пра вясёлку.

## Зямельку хмарка палівала...

Зямельку хмарка палівала:
«Вады, засмяглая, глыні».
А гром бурчаў ёй: «Мала! Мала!



Правообладатель Издательский центр БГУ

Яшчэ сыпні,
Яшчэ ліні!»



Мурог схіляў ніжэй галоўку,
Нібы прыслухацца жадаў,
Што дожджык з хмаркаю-сяброўкай
Яму спяваў,
Яму шаптаў.

І ўчуў: званочак сіні ў кроплях
Вызвоньваў радасна: «Дзінь-дзінь!
З табою, дожджык родны, цёплы,
Я ў лузе росным
Не адзін...»



Разгойдваў дожджык, як арэлі,
Званочкі, з іх сагнаўшы сон.
Званочкі ўраз павесялелі —
Прабег над лугам
Лёгкі звон.

Мурог спяваў у моры кветак,
Глядзеў на іх,
Дзівіўся з іх.
А дождж? Заслухаўся ён гэтак,



Правообладатель Издательский центр БГУ

Што перастаў,
Што раптам... сціх.

*Мікола Чарняўскі*

**Арэ́лі** — гушкалка.
**Муро́г** — тут: сакавітая трава, луг.

**1.** Ці спадабаўся вам верш? Чым?
**2.** Чаму траўка, кветачкі і ўся зямелька радаваліся дожджыку?
**3.** Прачытайце верш весела, перадайце радасць прыроды.

раз-бя-гá-е-цца, па-ста-рá-ю-цца, пе-ра-ля-тá-ю-чы, стра-кá-ты-я, а-смé-лі-цца, ад-бы-вá-е-цца

## Гульня ў хованкі

У лесе так: пакуль ты ідзеш і ўсюды свой нос соваеш, усё жывое наўкол ад цябе хаваецца і разбягаецца. Але варта толькі спыніцца альбо сесці, стаіцца, як тут жа ўсё мяняецца: цяпер усе табой пачынаюць цікавіцца.

Самыя цікаўныя ў лесе белабокія сарокі. Яны, вядома, першыя ўбачаць вас і пастараюцца ўсім абвясціць пра гэта. Пералятаючы з вершалінкі аднаго дрэва на другое, птушкі незадаволена крычаць:



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Вось ён! Вось ён! Трымайце яго! Трымайце!

Так, каб іх не было відаць, кружаць па хмызняку дразды. І здзіўлена ў саміх сябе пытаюцца:

— Ну хто б гэта мог быць? Што яму тут трэба?

Рыжая ліска часам зусім побач з табой пройдзе. Шэры заяц каля самых ног прабяжыць. Хоць ты солі яму на хвост насып.

Не праляцяць міма чалавека, які ціха сядзіць, матылькі — жоўтыя, чорныя, стракатыя. А іншы нават асмеліцца да борта пінжака прычапіцца. Сядзе і тут жа кветкай стракатыя крыльцы разгорне.

Што яны ў гэтую хвіліну пра цябе гавораць, цяжка сказаць. Бо наш чалавечы слых не здольны пачуць іхняй гаворкі, калі яна, зразумела, ёсць.

Усё гэта адбываецца да таго часу, пакуль вы ціха сядзіце. Але толькі крануліся з месца, як тут жа ўсё змяньваецца — хто ў куст, хто ў норку, хто на дрэвы. Шусь, скок — і маўчок.

*Рыгор Ігнаценка*

?! **1.** Чаму аўтар змог паназіраць заляснымі жыхарамі?

**2.** Хто самы цікаўны ў лесе? Прачытайце.

**3.** А як можна заўважыць у лесе драздоў? Знайдзіце, як іх апісвае пісьменнік.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Як паводзяць сябе ліса і заяц? Прачытайце.
**5.** Як апісваюцца матылькі? Раскажыце.
**6.** Што адбываецца ў лесе, калі пачынаеш рухацца?
**7.** Якія малюнкі можна зрабіць да апавядання?

## СКОРАГАВОРКІ

### Чэрвень

Чарнеюць
чарніцы,
і чырванеюць
суніцы.

### Ліпень

Лета. Ліпень.
Ліўнуў лівень.
Пахнуць ліпы
І маліны.

### Жнівень

Жняцы на ніве,
жне жыта жнівень.

*Васіль Жуковіч*

### Падлічы

Раслі чатыры бярозы,
На кожнай бярозе —
Па чатыры вялікія веткі,
На кожнай вялікай ветцы —
Па чатыры маленькія веткі,



Правообладатель Издательский центр БГУ

На кожнай маленькай ветцы —
Па чатыры яблыкі.
Колькі ўсяго яблыкаў?

Хі-хі-хі.
Ха-ха-ха.

## Загадкі з падказкамі

* * *

Спяшаецца,
як на пажар,
стараецца —
нясе цяжар,
не скардзіцца, што цяжка,
маленькая ... .

* * *

З выраю
першы вяртаецца,
з песняй
да свету звяртаецца,
поля і неба сябрук —
гэта, вядома, ... .

* * *

Як толькі дачакалася цяпла,
збіраць нектар
старанна пачала
працалюбівая ... .



* * *

Маю галінку вы ўзялі,
ў зямлю ўваткнулі, палілі —



Правообладатель Издательский центр БГУ

карэньчыкі яна пусціла
і ў рост пайшла з вялікай сілай.
Люблю расці я над вадой,
а называюся ... .

*Васіль Жуковіч*

?! * Паспрабуйце скласці сваю загадку пра свойскіх жывёл: пеўня, сабаку, ката.

## Загадкі

* * *

Вырас вожык за дарогай
У калючках, ды без ног.
Не каліся,
Не палохай
Нас усіх,
чарта...

*Мікола Чарняўскі*



* * *

Гудзе, ды не самалёт,
Можа раніць, ды не страла.
Хто адгадае, хто гэта?



Правообладатель Издательский центр БГУ

* * *

З «м» — я рыба,
З «я» — расліна.
З «к» мяне ўсе
Піць павінны.
З «с» я клічу
Ратаваць,
З «н» прымушу
Моцна спаць.

?! Які склад трэба паставіць перад гэтымі літарамі?

**Не магу жыць без Радзімы**

У дуброве, каля рэчкі,
Віснуць сочныя парэчкі,
Ў пералеску, ля крыніцы,
Ззяюць спелыя суніцы.
І вясной, і цёплым летам
Тут наўкола многа кветак.
Нівы жыта і пшаніцы,
У стаўку вада іскрыцца.
Журавель з вядром, калодзеж...
Дзе ж такое месца знойдзеш?
Ну, куды ж пайсці, падацца,
Па якой прайсці мне кладцы?



Правообладатель Издательский центр БГУ



Хараство, куды ні глянеш,
Ад світання да змяркання.
І парэчкі — каля рэчкі,
І суніцы — ля крыніцы...
Без цябе жыць немагчыма,
Мая любая Радзіма!

*Станіслаў Шушкевіч*

?! **1.** Якім настроем прасякнуты верш (радасным, сумным, вясёлым)?

**2.** Якімі цудоўнымі карцінамі прыроды любуецца паэт? Прачытайце.

**3.** Паразважайце, чаму «без цябе жыць немагчыма, мая любая Радзіма!».



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Адгадкі**

Малы малышак зваліўся з вышак...
(Арэх, жолуд) ........................................ 17
Шустранькі, маленькі... (Верабей) ..................... 63
Ляціць арліца па сіняму небу... (Хмара)................. 63
Белае поле, чорнае насенне... (Літары ў кнізе) ..... 70
Жыве пад ганкам, хвост абаранкам... (Сабака).... 73
Што для чалавека мілей... (Сон) .......................... 80
Што можна ўбачыць
з заплюшчанымі вачамі... (Сон) ........................... 80
***Не званочак, а звініць... (Ручаёк)................... 97
***Паўзун паўзе, іголкі вязе... (Вожык)............... 98
Глянеш — заплачаш... (Сонейка) .........................111
***Спяшаецца, як на пажар... (Мурашка) ........... 118
***З выраю першы вяртаецца... (Жаўрук).......... 118
***Як толькі дачакалася цяпла... (Пчала) ........... 118
***Маю галінку вы ўзялі... (Вярба) ..................... 118
***Вырас вожык за дарогай... (Чартапалох) ...... 119
***Гудзе, ды не самалёт... (Пчала) ..................... 119
***З «м» — я рыба, з «я» — расліна...
(Сом, соя, сок, сос, сон) ..................................... 120

Правообладатель Издательский центр БГУ

## ЗМЕСТ

**НАПІСАЎ Я КАЗКУ — СЛУХАЙ, КАЛІ ЛАСКА!** ....... 3
**Літаратурная казка** ........................................ 3
Дружбакі. *Расціслаў Бензярук* ............................ 3
Як Мышка сама сябе ашукала. *Іван Бурсаў* ........... 6
Разумны пеўнік. *Уладзімір Ліпскі* ..........................10
Падманшчыца. *Аўяр'ян Дзержынскі* ....................14
Жолуд-баязлівец. *Іван Вярыга* ...............................15
Загадка .........................................................17
**Казкі-загадкі** .............................................18
Брат і сястра. *Расціслаў Бензярук* .........................18
Працавітыя і дружныя. *Расціслаў Бензярук* ..........20
**Небыліцы** .....................................................21
Сказаць навіну? *Васіль Жуковіч* ...............................21
Ляцелі вароты... *Васіль Жуковіч* ..............................21
Усмешка. *Галіна Васілеўская* .................................21

**СЦЕЖКІ ДЗЯЦІНСТВА** ........................................27
Дзеці. *Артур Вольскі* ...........................................27
Колькі раніц месціць ранец? *Рыгор Барадулін* ......30
Будзень і Свята. *Расціслаў Бензярук* .....................32
Прыказка ........................................................35
Пра казачных чалавечкаў. *Ядвіга Бяганская* .........36
Цяжкі выбар. *Мікола Сянкевіч* ...............................40
Параска і падказка. *Эдзі Агняцвет* .........................42
Заўважаная памылка. *Вісарыён Гарбук* ..................45
Прыказкі ........................................................47



Правообладатель Издательский центр БГУ

Хвалько. *Рыгор Бойка* ........................................ 48
Смяшынкі. *Аўяр'ян Дзержынскі* ........................................ 49
***—Ты пачаў, Ясь, лепш вучыцца... ........................................ 49
***—Чаго ты ў цёмных акулярах... ........................................ 49
Баязліўка. *Аўяр'ян Дзержынскі* ........................................ 49
Крыўда. *Васіль Хомчанка* ........................................ 50
Смяшынка ........................................ 51
А таму! *Мікола Янчанка* ........................................ 52
Падарунак. *Паводле Анатоля Кудраўца* ........................................ 55
Пераблыталіся словы. *Пятро Сушко* ........................................ 58
Мора. *Ніна Галіноўская* ........................................ 58
Хлопчык і Кацянё. *Эдуард Валасевіч* ........................................ 60
Задзіры. *Васіль Ткачоў* ........................................ 61
Загадкі ........................................ 63
***Шустранькі, маленькі... ........................................ 63
***Ляціць арліца... ........................................ 63
Балбатуха Міла. *Аўяр'ян Дзержынскі* ........................................ 64
Яшава бяда. *Іван Вярыга* ........................................ 66
***Адзін — і сее, і будуе... *Міхась Пазнякоў* ........................................ 68
Мой сябар. *Мікола Чарняўскі* ........................................ 69
Загадка ........................................ 70
Сустрэча. *Іван Вярыга* ........................................ 70
Загадка ........................................ 73
Татава аўтаручка. *Мікола Гіль* ........................................ 73
Чаму спыніўся гадзіннік. *Рыгор Бойка* ........................................ 75
Бабулі. *Аўяр'ян Дзержынскі* ........................................ 76
Бабка Адарка. *Барыс Сачанка* ........................................ 77
Жарт ........................................ 79



Правообладатель Издательский центр БГУ

Каб сон не ўцёк... *Авяр'ян Дзеружынскі* .......... 80
Загадкі .......... 80
Дзякуй. *Мікола Янчанка* .......... 80
Хто вінаваты? *Алесь Жук* .......... 82
Хлеб. *Барыс Сачанка* .......... 84
Хлебная скарынка. *Авяр'ян Дзеружынскі* .......... 87
Нарэшце зразумеў. *Павел Кавалёў* .......... 88
Самае добрае. *Балгарская народная казка* .......... 90
Дарэмная праца. *Ніна Галіноўская* .......... 92
Прыказкі .......... 92

**ВЯСНОВА-ЛЕТНЯЯ СТАРОНКА** .......... 93
Жавароначкі, прыляціце. *Уладзімір Ягоўдзік* .......... 93
Пралеска. *Авяр'ян Дзеружынскі* .......... 95
Вожык і ручаёк. *Янка Галубовіч* .......... 96
Загадкі .......... 97
***Не званочак, а звініць... .......... 97
***Паўзун паўзе... .......... 98
Скорагаворкі .......... 98
Сакавік .......... 98
Красавік .......... 98
Травень. *Васіль Жуковіч* .......... 98
Дзеці на парашутах. *Васіль Вітка* .......... 99
Як сеялі абаранкі. *Іван Муравейка* .......... 101
Фіялка. *Клаўдзія Каліна* .......... 103
Перасмешнік. *Клаўдзія Каліна* .......... 105
Лета. *Сяргей Грахоўскі* .......... 107
Чэрвень і Сонейка. *Паводле Клаўдзіі Каліны* .......... 109



Правообладатель Издательский центр БГУ

Загадка .......................................................... 111
Як рабілі вясёлку. *Яраслаў Пархута* .................. 111
Зямельку хмарка палівала... *Мікола Чарняўскі*..... 113
Гульня ў хованкі. *Рыгор Ігнаценка*....................... 115
Скорагаворкі ...................................................... 117
Чэрвень .......................................................... 117
Ліпень............................................................ 117
Жнівень. *Васіль Жуковіч*.................................... 117
Падлічы .......................................................... 118
Загадкі з падказкамі. *Васіль Жуковіч* ................ 118
***Спяшаецца, як на пажар... ........................... 118
***З выраю першы вяртаецца... ......................... 118
***Як толькі дачакалася цяпла... ........................ 118
***Маю галінку вы ўзялі... ................................ 118
Загадкі .......................................................... 119
***Вырас вожык за дарогай...
*Мікола Чарняўскі*.............................................. 119
***Гудзе, ды не самалёт... ................................ 119
***З «м» — я рыба... ......................................... 120
Не магу жыць без Радзімы.
*Станіслаў Шушкевіч*.......................................... 120

Адгадкі .......................................................... 122

Правообладатель Издательский центр БГУ

(Назва і нумар школы)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Варапаева, В. С.**
В18 Літаратурнае чытанне : вучэб. дапам. для 3-га кл. спец. агульнаадукац. шк. з беларус. мовай навучання. У 2 ч. Ч. 2 / В. С. Варапаева, Т. С. Куцанава. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2011. — 127 с. : іл.
ISBN 978-985-476-875-5.

Вучэбны дапаможнік для 3-га класа спецыяльных агульнаадукацыйных школ для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення, для дзяцей з цяжкасцямі ў навучанні з беларускай мовай навучання.

**УДК 821.161.3.09(075.2=161.3)–056.313**
**ББК 74.3**

Вучэбнае выданне

**Варапаева** Валянціна Сцяпанаўна
**Куцанава** Таццяна Сцяпанаўна

**ЛІТАРАТУРНАЕ ЧЫТАННЕ**

Вучэбны дапаможнік для 3 класа спецыяльных агульнаадукацыйных школ з беларускай мовай навучання

У дзвюх частках
Частка 2

Галоўны рэдактар *Т. Я. Янчук.* Дызайн вокладкі *Л. У. Ледзеневай*
Рэдактар *А. В. Семенчукова.* Мастакі *Ю. В. Качаргіна, М. М. Рудакоўская, Т. А. Сучкова*
Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка *К. У. Раманчык*
Карэктары *В. М. Іваноў, Н. Б. Кучмель, Т. І. Рыбакова*

У афармленні вокладкі выкарыстаны фотаздымак Віктара Атапіна.

Падпісана ў друк 29.04.2011. Фармат 70×90 1/16. Папера афсетная № 1. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 9,36. Ул.-выд. арк. 4,2. Тыраж 830 экз. Заказ 1045.

Выдавец і паліграфічнае выкананне: рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
ЛИ № 02330/0494361 ад 16.03.2009. ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.

Правообладатель Издательский центр БГУ